Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!
БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ САВЕЦКАЯ РЭСПУБЛІКА

4-ты год выданьня

БЕЛАРУСКАЯ
МЭДЫЧНАЯ ДУМКА

(БЕЛОРУССКАЯ МЕДИЦИНСКАЯ МЫСЛЬ)

№ 6—7

ЧЭРВЕНЬ—ЛІПЕНЬ
1928

ВЫДАНЬНЕ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ
АХОВЫ ЗДАРОЎЯ Б. С. С. Р.
МЕНСК

От редакции

При VII номере журнала „Беларуская Мэдычная Думка“ платным подписчикам рассылается в качестве приложения книга проф. С. М. Рубашева: „Аппендицит в его влиянии на заболевания других органов брюшной полости“.

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!
БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ САВЕЦКАЯ РЭСПУБЛІКА

4-ты год выданьня

БЕЛАРУСКАЯ МЭДЫЧНАЯ ДУМКА

(БЕЛОРУССКАЯ МЕДИЦИНСКАЯ МЫСЛЬ)

№ 6—7

ЧЭРВЕНЬ—ЛІПЕНЬ
1928

ВЫДАНЬНЕ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ
АХОВЫ ЗДАРОЎЯ Б. С. С. Р.
МЕНСК

Друкавана ў 2-ой друкарні-
літографіі Беларускага
Дзяржаўнага Выд-ва
Галоўлітбел 1644
У ліку 700 экз.
Заказ 2770.

ОБЩЕСТВЕННОЕ ЗДРАВООХРАНЕНИЕ и ГИГИЕНА

Усе на барацьбу з сухотамі

М. Барсукоў

З 22-га па 24 чэрвеня г. г. Нар. Кам. Аховы Здароўя праводзіць па ўсёй БССР сухотны трохдзёньнік. У гэтыя дні кожны працоўны павінен успомніць, праверыць, што ён зрабіў для барацьбы з сухотамі, як ён дапамог дзяржаве ў справе вызваленьня ад гэтай жудаснай хваробы, якая калечыць маладое жыцьцё, вырывае з шэрагаў рабочае клясы і сялянства так патрэбную для будаўніцтва народнай гаспадаркі рабочую сілу.

Мы занадта звыкліся з сухотамі, яны сталі ў нас звычайным зьявішчам, а таму мы часта забываемся пра тую грозную небясьпеку, пра тыя цяжкія вынікі, якія нясе з сабой гэта жудасная хвароба—спадчына нявольніцтва, эканамічнага ўціску і культурнай адсталасьці.

У Беларусі штогод памірае ад сухотаў прыблізна каля 12.000 ч. А колькі з застаўшыхся ў жывых застаюцца інвалідамі. Колькасьць згубіўшых працаздольнасьць ад сухотаў, бязумоўна, вялікая і лік іх перавышае лік памёршых.

Дарма думаюць многія, што сухоты ня так небясьпечная хвароба па свайму заражэньню, як іншыя інфэкцыі. Гэта толькі так здаецца. Таксама, як плямісты тыфус, воспа—сухоты лёгка перадаюцца ад хворага да здаровага і, бязумоўна, зьяўляюцца заразьлівай хваробай.

Праўда, у адзнаку ад іншых заразьлівых хваробаў, сухоты падкрадваюцца паволі, няпрыкметна і не адразу выяўляюць сваю руйнуючую чыннасьць. Але затое раз пачаўшыся, яны пачынаюць упарта падтачваць сілы чалавека, і калі ня прыняты сваячасова меры, дык захварэўшы назаўсёды выводзіцца з строю.

Сухоты—хвароба масавая, цэлага калектыву, бо яна надта заразьлівая і цалком залежыць ад умоў быту, у якіх жыве чалавек.

Ніводная хвароба гэтак наяўна не залежыць ад быту, як сухоты. Тут на кожным кроку можна назіраць, як малейшая драбніца—адсутнасьць санітарных навыкаў, някультурнае ў санітарным сэнсе жыцьцё—балюча б'е па чалавеку і зараз-жа дае аб сабе ведаць праз разьвіцьцё сухотнага працэсу.

Сухоты баяцца сонца, чыстага паветра, добрага харчаваньня. Там, дзе чалавек жыве ў душнай хаце, якая не праветрываецца, як гэта часта можна бачыць у беларускага селяніна, калі хата вільготная і цёмная, напоўсутарэннага тыпу, калі паветра ў пакоі мала і, урэшце, калі прыходзіцца не даядаць,—усё гэта разам узятае,—лепшыя падыходзячыя ўмовы, каб сухотнаму мікробу моцна, грунтоўна замацавацца ў чалавечым арганізьме.

Вось чаму цяпер, калі ўся наша краіна саветаў перажывае паласу ліхарадачнага жыльлёвага будаўніцтва, калі партыя абвясьціла лёзунг аб культурнай рэвалюцыі—неабходна ўважлівей падыйсьці да пытаньняў санітарнага дабрабыту нашага жыцьця.

Гэтаму канешна адпавядае належная колькасьць профіляктычных установ, якімі зьяўляюцца псыхо-нэўролёгічныя дыспансэры. На працягу бліжэйшых год мы ня можам і марыць аб такіх нормах.

У РСФСР прынята норма 1 ложак на 1.000 насельніцтва. Канешне, такая сець дала-б магчымасьць ізаляваць востра душэўна хворых, прымаючы захварваемасьць насельніцтва 3% і зварочваемасьць ложку прыблізна 2—3 разы ў год. Аднак, павялічэньне ложкавага фонду на працягу 5-ці год мяркуецца толькі на 55%, што ні ў якім разе не дазволіць дасягнуць паказанай мэты і толькі нязначна зьнізіць маючыйся каэфіцыэнт. Калі прыняць, што ў БССР знаходзіцца прыблізна 15.000 псых. хворых, 30% з якіх гэта значыць, 5000 чал. патрабуюць абавязковай ізаляцыі, як пагражаючыя акружаючым, дык дзеля ізаляцыі іх нам патрэбна было-б разгарнуць 2.500 ложкаў, што на працягу бліжэйшых год ажыцьцявіць ні ў якім разе не магчыма па той прычыне, што гэта запатрабавала-б вялізарныя сродкі на будаўніцтва.

Трэба заўважыць, што паказаная колькасьць хворых ёсьць не абсалютная і павінна быць значна вышэй па той прычыне, што вылічэньні хворых рабіліся на падставе статыстычных паданых даваеннага часу псыхіатрычнай захварваемасьці насельніцтва Маскоўскай губэрніі, якая вызначаецца ў 3,21 на 1.000 насельніцтва. У сучаснасьці-ж мы маем, асабліва ў Беларусі, значна вышэйшую захварваемасьць, што тлумачыцца тым, што тэрыторыя Беларусі на працягу амаль-што 7 год зьяўлялася арэнаю імпэрыялістычнай вайны, акупацыйных падзей, і бандытызму. Усе гэтыя моманты вельмі значна панізілі абароназдольнасьць арганізму беларускага насельніцтва і зрабілі на яго вялікі псыха-траўматычны ўплыў.

У гэтыя гады мы наглядаем павялічэньне прытоку па ўсім нашым больніцам хворых прагрэсыўным паралічом, што таксама зьяўляецца водгукам імпэрыялістычнай вайны і акупацый. Значную ролю ў павялічэньні псыхіатрычных захварваньняў адыгрывае і пашырэньне алкагалізму.

Усё гэта прымушае нас зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю псыхіатрычнай дапамогі. Якім-жа шляхам яна павінна ісьці. Выдатнейшымі псыхіатрамі мінулага стагодзьдзя, пачынаючы з Эсквіроля і Грызэнгаўзэра даказана, што чым раней псыхычны хворы ізаляваны ў лячэбніцу, тым лепшы прагноз яго хваробы, тым пасьпяховей ідзе лячэньне і тым большы процант выздараўленьня. Сучасны-ж погляд псыхіатрыі ідзе далей па шляху актыўнай прафіляктыкі па прыкладу мэтадаў барацьбы з сацыяльнымі хваробамі, як тубэркулёз і вэнэрычныя хваробы. Профіляктывізацыя псыхіатрычных захварваньняў набывае асаблівую ўвагу ў сувязі з павялічэньнем такіх захварваньняў, якія стаяць на мяжы з нэрвовымі хваробамі і вельмі часта без належнага нагляду абцяжваюцца і пераходзяць у формы, якія патрабуюць ужо зацяжнага стацыянарнага лячэньня. Між тым, раньняе вынаходжваньне такіх хворых, належны догляд за імі, адпаведнае амбуляторнае лячэньне, адхіленьне ад іх шкодных прафэсыйных і сацыяльных момантаў часта дазваляе захаваць хворага на доўгі час працаздольным, а бывае зусім выратаваць яго ад пагрозы „сумасшэдшага дому“. Прафіляктычны напрамак гэтым як-бы адмяняе ранейшы характар псыхіатрыі—бальнічнай апекі (Anstaltpsychiatrie) высоўваемае пытаньне раньняга вынаходжваньня такіх хворых, якія стаяць на мяжы з нэрвовымі, ажыцьцяўляецца інстытуцыямі, якімі зьяўляюцца псыха-нэўралёгічныя дыспансэры. Па паказаным прычынам сумежнасьці псыхіатрычных захварваньняў з нэрвовымі, дзейнасьць нэрвова-псыхіатрычных дыспансэраў павінна быць цесна ўвя-

зана на абадва бакі як з псыхіатрычным, так і з нэрвовым стацыянарам, як з псыхіатрамі, так і з нэўра-паталёгамі і толькі пры такім узаемным кантакце можа быць пасьпяховая праца.

Яшчэ больш раньняй формай прафіляктыкі зьяўляецца псыхосанітарная асьвета ў форме популярызацыі псыха-гігіены, якая павінна знайсьці мейсца як у школе, так і на прадпрыёмстве, а таксама і ў быту насельніцтва. Пытаньні выхоўваньня дзяцей, барацьбы з алкагалізмам, палавое пытаньне—павінны знайсьці належнае асьвятленьне перад шырокімі коламі працоўных. Агульна-даступная літаратура па паказаных пытаньнях павінна мець належны кантроль сан. асьветы, бо ў вялікай колькасьці паказанай літаратуры спатыкаецца неадказваючая запатрабаваньням, а падчас і шкодная, асабліва ў галіне палавога пытаньня.

Выходзячы з паказаных меркаваньняў, мы па-першае, павінны зьвярнуць увагу на пашырэньне нашага вельмі невыстарчальнага ложкавага фонду. Па 5-ці гадоваму пляну НК Аховы Здароўя БССР павялічэньне колькасьці псых. ложкаў у параўнаньні з 1927-28 г. мяркуецца на 42,5%—380 ложкаў, што зьнізіць сучасны коэфіціэнт 1 на 5.600 да 1 на 4.160. Гэта павялічэньне запатрабуе пабудовы аднэй новай псых. больніцы, мяркуецца ў Гомлі на 200 ложкаў і пашырэньне псых. калёніі Навінкі пабудоваю барака на 75 ложкаў. Разам з псвялічэньнем колькасьці неабходна будзе зьвярнуць увагу і на яка нае палепшаньне існуючых ложкаў шляхам рамонту, павялічэньнем абсталяваньня, колькасьці бялізны, палепшаньнем харчаваньня і г. д.

З боку паказаных момантаў у нас таксама справа стаіць нездавальняюча. Лекавыя ўстановы перагружаны па той прычыне, што павялічэньне колькасьці ложкаў ішло не заўсёды роўналежна з будаўніцтвам. Адзначаецца таксама невыстарчальнае харчаваньне, а таксама востры недахоп бялізны і верхняе вопраткі. Так, толькі ў гэтым годзе ў Магілеўскай псыхбольніцы маецца 1 комплект бялізны на хворага, што датычыцца Менску і Віцебску, то тут яшчэ няма і гэтага. Дзякуючы паказанаму хворыя прымушаны большую часьць году знаходзіцца ў закрытых памяшканьнях, што выклікае кіслароднае галаданьне, якое разам з невыстарчальным кармленьнем дае вялікую сьмяротнасьць хворых ад тубэркулёзу, даходзячую да 12% і ставіць нас у першыя шэрагі сярод другіх Рэспублік Саюзу.

Мяркуемае павялічэньне ложкаў будзе аднак невыстарчальным і разам з гэтым дзеля зьменшаньня ложкавага голаду неабходна будзе зьвярнуць увагу на пашырэньне патраніраваньня псіхіатрычных хворых. Гэта мерапрыемства зьяўляецца больш танным, чым разгортваньне ложкавай сеці і дае добрыя вынікі пры ўмовах лекавага нагляду над патраніраванымі, дзеля чаго патранат неабходна разгортваць будзе пры маючыхся псіхіатрычных больніцах. Гэта дасьць больніцам магчымасьць у крытычныя моманты эвакуіраваць беспрытульных паправіўшыхся хворых, што паможа разгрузцы больніц. Дзеля цэлага шэрагу хворых патраніраваньне можа зьяўляцца і тэрапэўтычным мерапрыемствам. Зварот хворага з бальнічных абставін к умовам сямейнага быту захоўвае яго душэўныя здольнасьці і часткова збаўляе ад інваліднасьці. Народным Камісарыятам Аховы Здароўя мяркуецца пашырэньне патранату пры калёніі Навінкі да 50 месц, пры Магілеўскай псыхбольніцы 75 месц і Віцебскай—50. Аднак, гэтага невыстарчальна і неабходна будзе таксама і мясцовым бюджэтам пайсьці на падтрыманьне гэтага мерапрыемства.

Разгортваньне дыспансэраў мяркуецца перш-на-перш у больш прамысловых і залюдненых цэнтрах, дзе чакаецца большы профэсыйны

траўматызм, алкоголізм і іншыя шкодныя моманты з аднаго боку, а з другога там, дзе маюцца псыхіатрычныя больніцы. Такімі месцамі ў нас зьяўляюцца Віцебск і ў будучым Гомель. Больш сільнага разьвіцьця псыха-нэўролёгічных дыспансэраў пакуль што дапусьціць немагчыма па той прычыне, што колькасьці дыспансэраў павінна адказываць вядомая колькасьць і ложкавага фонду. Трымаючы самую цесную сувязь з псыхіатрычнымі бальніцамі, дыспансэры дапоўняць іх працу, абслугоўваючы сумежныя формы з душэўнымі захвараваньнямі і з душэўнымі хворымі, якія знаходзяцца сярод насельніцтва, возьмуць на сябе ўнебольнічную і профіляктычную дапамогу. Праз дыспансэры псыхбольніцы змогуць пашыраць розныя віды патранажу. Дыспансэры арганізуюць дапамогу такім хворым, якім патрэбна будзе ў амбулятораных абставінах псыхатэрапія, псыхатэхніка, лячэньне заік (логопэдыя), фізіотэрапэўтычная дапамога і інш. Дыспансэры павінны будуць разгарнуць псых.-сан.-асьветную працу, праводзіць вучот душэўна хворых.

Неабходна будзе такжа арганізаваць такія віды лячэньня, якія да гэтага часу ў нас адсутнічалі. Першае, гэта лячэньне дарослых псыханэўротыкаў, а другое—дзяцей. Дзеля першых зьявіцца магчымым арганізаваць аддзяленьне на 25 ложкаў на тэрыторыі 2-й Сав. бальніцы ў Менску пры псыхіатрычнай клініцы, пасьля пабудовы унівэрсытэцкага клінічнага гарадку, а дзеля дзяцей мяркуецца пабудова псыхо-нэўролёгічнага санаторыя на 100 ложак.

Патрэбна таксама будзе зьвярнуць увагу на большы ўдзел у нэўропсыхіатрычнай дапамозе насельніцтву ўрачэбнага вучастка, які павінен быць нізавою ячэйкаю ў гэтай справе. Вучастковы доктар вядзе вучот душэўна хворых на вёсцы, першапачатковую рэгістрацыю іх; праз яго ідзе адбор і накіраваньне хворых у псыхлячэбніцы, ён наглядае за хворымі, якія жывуць сярод насельніцтва; пры дапамозе Саветаў Сацыяльнай дапамогі арганізуе мясцовы патранат і сямейную апеку і нарэшце вядзе псых-сан-асьветную працу.

Ажыцьцяўленьне намяркованых мерапрыемстваў дазволіць зьменшыць колькасьць інвалідаў, апякуемых душэўна-хворых у больніцах, дасьць большую магчымасьць захаваць наш нэўро-псыхіатрычны „бюджэт“. Будаўніцтва сацыялізму немагчыма без здаровых нэрваў і здаровай псыхікі.

Асноўныя моманты пабудовы пяцігадовага пэрспэктыўнага пляну санітарнае сэкцыі НКАЗ Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, у сувязі з адміністрацыйным падзелам яе, пэрспэктыўным плянам агульнааздаравіцельных мерапрыёмстваў і разьвіцьцем народнае гаспадаркі *)

Д-р З. К. Магілеўчык

Санітарнае аздараўленьне рэспублікі і стварэньне санітарнае культуры ў агульнай сыстэме савецкага будаўніцтва мае вялікае значэньне. Без аздараўленьня ўмоў працы і быту працоўных ня можна думаць аб посьпеху сацыялістычнага будаўніцтва. Важнасьць санітарнае справы ў агульнай сыстэме савецкага будаўніцтва зараз зразумела ўсім працоўным. За кароткі параўнаўча пэрыяд існаваньня севецкае мэдыцыны і разьвіцьця, у пяршыню ў БССР, санітарнае справы мы маем значныя і відавочныя вынікі. У параўнаньні з мінулым мы маем зьніжэньне эпідэмічнасьці, павялічэньне нараджальнасьці і зьмяншэньне сьмяротнасьці, укараненьне санітарнае культуры ў масы працоўных і г. д. Але ўсе нашы дасягненьні на фронце аздараўленьня працоўных, у параўнаньні з тым, што патрэбна, уяўляюць сабой толькі як выхад з цяжкае спадчыны мінулага. Наделей застаецца яшчэ вялікая. цяжкая праца і на доўгі час, каб ліквідаваць усе тыя нездаровыя абставіны, якія вякамі накладалі цяжкі адбітак на працоўных і застаюцца яшчэ і на сёньня. Санітарная справа і правадыр яе—санітарная арганізацыя павінны разьвівацца і мацнець.

Плянаваньне агульнааздаравіцельных мерапрыёмстваў і пабудова санітарнае сеці вымагаюць ня меншае ўвагі і абасновы чымся іншыя галіны плянаваньня савецкага будаўніцтва. Пабудова санітарнае сеці павінна быць увязана ня толькі з мерапрыемствамі па пляну НКАЗ, але і з цэлым шэрагам іншых акалічнасьцяй, якія вынікаюць з агульнага плянавага будаўніцтва і сучаснага стану рэспублікі.

У аснову пабудовы санітарнае сеці, паступовага пашырэньня і ўзмацненьня яе павінны быць пакладзены паступныя адзнакі:

а) Адзнакі адміністрацыйнага падзелу БССР—раёніраваньне, тэрыторыя абслугоўваньня і шчыльнасьць залюднёнасьці.

б) Эпідэмічнае становішча Рэспублікі наогул і ў тэрыторыяльных адносінах у прыватнасьці.

в) Вызначаемы рост агульна-аздаравіцельных мерапрыёмстваў і дабрабыту залюдненых месц.

г) Важнасьць паасобных залюдненых месц у агульным жыцьці Рэспублікі і пэрспэктывы ўсебаковага росту іх у будучым

д) Рост прамысловасьці наогул і тэрыторыяльныя адзнакі разьвіцьця яе ў прыватнасьці, а таксама характар прамысловасьці ў адносінах важнасьці і неабходнасьці санітарнага абслугоўваньня яе.

*) Даклад на XI Усесаюзным зьезьдзе бактэрыолёгоў, эпідэміолёгаў і сан. дактароў 21—27 мая 1928 г., Ленінград.

е) Існуючае палажэньне санітарнай арганізацыі ў адносінах задаваленьня патрэб санітарнага абслугоўваньня Рэспублікі.

ж) Аб'ём і сфэра дзейнасьці санітарных органаў, паводле пастановы СНК БССР „аб санітарных органах НКАЗ".

з) Фінансавая магчымасьць.

Усё памянёнае складае тую аснову, паводле якой павінна будавацца і мацнець санітарная арганізацыя. Зараз трэба ўнесьці яснасьць у арганізацыйную форму пабудовы санітарнае сеці. Арганізацыйная форма пабудовы санітарнае сеці павінна адпавядаць прынцыпам адміністрацыйна-гаспадарчага падзелу Рэспублікі.

Адміністрацыйна-гаспадарчае ўпарадкаваньне БССР зараз скончана, што ў значнай меры палягчае дакладнае плянаваньне ўсіх галін савецкага будаўніцтва.

У адміністрацыйна-гаспадарчых адносінах БССР падзяляецца на 8 акруг, 101 раён і 1694 сельсаветы. Залюднёных месц налічваецца 38.411, з якіх пасяленьняў гарадзкога тыпу разам з акруговымі гарадамі—84 (29 гарадоў і 55 мястэчак), пасяленьняў сельскага тыпу—38.327. Усяго насельніцтва - 4.983.240 чал. У гэтым ліку 16,4% гарадзкога насельніцтва. Гарадоў з насельніцтвам да 10.000 чал.—17, ад 10.000 да 20.000—4, ад 20.000 да 50.000—3, ад 50 да 75 тыс.—2, ад 75 да 100 тысяч—2, звыш 100.000—1. Агульная плошча Рэспублікі 125.950 кв. кілём., сярэдняя плошча раёну—1.247 кілём., сельсавета—73,2 кілём. Залюднёнасьць на 1 кв кілём.—агульная 39,5, у сельскіх мясцовасьцях (без гарадоў)—33 чал. Пры чым залюднёнасьць і тэрыторыя паасобных раёнаў маюць значныя адхіленьні ад сярэдніх лічбаў, што зьвязана з асаблівасьцямі натуральных і кліматычных умоў у розных частках Рэспублікі. Так, меншую залюднёнасьць і большую тэрыторыю на раён мае Мазырская акруга (лясістая і балоцістая частка Рэспублікі)—залюднёнанасьць 22 чал. на кв. кілём., а плошча раёну 1603,1 кв. кілём. Віцебская і Аршанская акругі наадварот—плошча раёну ў кв. кілём. Віцебскае 1033, Аршанскае—`34, 3 кв. кілём., а залюднёнасьць у Віцебскай акр. на 1 кв. кілём.—51,3, у Аршанскай—49,0.

Адзнакі адміністрацыйна-гаспадарчага падзелу і пакладзены намі ў аснову вызначэньня строю санітарнае арганізацыі. Паводле гэтых даных намі вызначан акруговы строй санітарнае арганізацыі, які адпавядае ў пераёніраваных краінах—губэрскаму. Прыняць рэспубліканскі строй—будзе грамоздка, а раён—за малы і паводле іншых прычын, пераважна эканамічнага парадку, ня можна думаць аб стварэньні цэльнага і моцнага арганізму санітарнае арганізацыі. Апрача гэтага раёны толькі трэці год пачынаюць ахапляцца санітарнай сеткай.

Зараз спынімся яшчэ на вельмі важным арганізацыйным моманце,—як мы ўяўляем сабе санітарную сетку і арганізацыйную сувязь яе ў Рэспубліканскім маштабе. Нізавой сеткай санітарнае арганізацыі трэба лічыць раённую, якая разам з гарадзкой санітарнай арганізацыяй уяўляе акруговую на чале з акруговым санітарным доктарам. Акруговая санітарная сець павінна ўяўляць цэльны і моцны арганізм акруговага строю санітарнае арганізацыі, маючы для сваёй дзейнасьці матар'яльную базу і будучы самастойнай і адказнай за сваю працу пад агульным кіраўніцтвам Сан.-Эпід. Часьці НКАЗ і яго навуковых Інстытутаў—у навуковых адносінах.

Раённая санітарная сець, мы лічым, у працэсе свайго разьвіцьця павінна складацца з раённага санітарнага доктара, яго памоцніка, раённай сан.-бакт. лябараторыі з трыма штатнымі адзінкамі ў сярэднім (у гэтым ліку 1 штатная адзінка для профіляктычных прышчэпак), дэзпункта з двума штатнымі адзінкамі і транспартам, санасьветнай базы—выстаўкі перасоўкі.

Кожны раён павінен мець сваю сан. арганізацыю. Ад пабудовы міжраённай санітарнай сеці нават у выпадках меншай залюднёнасьці раёнаў і пераважна сельска-гаспадарчым значэньнем іх, трэба адмовіцца. Па-першае, як вышэй ужо адзначана, меншая залюднёнасьць яшчэ на адзначае сабой меншую тэрыторыю абслугоўваньня. Па другое, падобныя раёны зьяўляюцца найбольш адсталымі ва ўсіх адносінах свайго разьвіцьця, у прыватнасьці—у санітарных адносінах. Па-трэцяе, пабудова міжраённай санітарнай сеці не адпавядае прынцыпам адміністрацыйна-гаспадарчага і тэрытарыяльнага падзелу Рэспублікі. Па-чацьвертае, абслугоўваньне двох раёнаў, як паказвае вопыт, адбіваецца на якасьці самай працы. Пры дрэнных грунтавых дарогах, неналаджанасьці транспарту, значнай тэрыторыі абслугоўваньня і раскіданасьці залюдненых пунктаў, цяжка абслужыць нават адзін раён. У крайнім выпадку можна згадзіцца на аднаго воспапрышчэпніка на 2 раёны, у працы якого можна вызначыць плянавае і паступовае абслугоўваньне аддалёных ад больніцы і мэдыцынскіх вучасткаў залюдненых пунктаў. Яшчэ можна згадзіцца на абслугоўваньне другога раёну, як на часовую меру, у выпадку выбуху ў сумежным раёне эпідэміі і калі ён ня мае свае санітарнае арганізацыі. Лепш з меншым абхватам і паступова, але з глыбокім падыходам у працы, што дасьць задаволеньне санітарным работнікам і большую карысьць агульнай санітарнай справе.

Гарадзкую санітарную арганізацыю ў адносінах абслугоўваньня гарадоў агульным санітарным наглядам у ўмовах БССР больш мэтазгодна будаваць па прынцыпу раённага падзелу іх, г. е. замацоўваючы за санітарным доктарам і яго памоцнікам пэўныя раёны, але не ўтвараючы абасобнасьці іх. Цэнтрам, вакол якога групуецца ўся санітарнаю-дзейнасьць, трэба лічыць Акруговую сан.-банк. лябараторыю пад агульным кіраўніцтвам акруговага санітарнага доктара. Падобная сувязь не азначае сабой, што агульная санітарная дзейнасьць санітарных дактароў павінна затушавацца лябараторнай, гэта ёсьць толькі больш шчыльная сувязь агульнасанітарнай дзейнасьці з лябараторнай, не зьмяншаючы аб'ёму і значэньня першай. Апрача гэтага падобная сувязь будзе ўяўляць сабой больш цэльны асяродак санітарнай арганізацыі—санітарную станцыю, ці, калі можна так назваць,—санітарна-прафіляктычны дыспансэр, дзейнасьць якога ў большай меры, чымся зараз, будзе грунтавацца на аб'ектыўных даных—лябараторных досьледах. Месцанахаджэньне санітарных дактароў у складзе Інспэктуры Аховы Здароўя адбіваецца на непасрэднай санітарнай працы, з прычыны частага ўскладаньня на санітарных дактароў такой працы, якая ня мае ніякіх адносін да санітарнае працы. Будучы разам з Інспэктурай, з прычыны цэлага шэрага акалічнасьцяй, амаль немагчыма мінаваць гэтага.

Акруговыя сан.-бакт. лябараторыі, як паказвае сама назва, павінны мець два аснаўных аддзелы—санітарны, з пераважным утварэньнем санітарна-тэхнічных, харчовых і водных аналізаў, і бактэрыолёгічны аддзел з пераважным утварэньнем аналізаў эпідэміолёгічнага характару і прафіляктычных прышчэпак. Апрача сан.-бакт лябараторый у кожным акруговым горадзе павінна быць дэзстанцыя з наладжаным транспартам і ізалятарам пры ім, санітарна-асьветная база—музэй-выстаўка. Што датыча штатаў у памянёных установах, дык тут трэба лічыцца з аб'ёмам і важнасьцю работы, якая вынікае з агульных умоў жыцьця таго ці іншага гораду і акругі. Як убачым ніжэй, акруговыя гарады большасьць санітарных установ маюць; надалей, у працягу 5 год, трэба зьвярнуць увагу на абсталяваньне і палепшаньне ўмоў працы іх, а дзе не хапае—на арганізацыю.

Што датыча норм абслугоўваньня гарадоў бягучым санітарным наглядам—НКАЗ за аснову бярэ, як і ў іншых Рэспубліках, адзін санітарны доктар і памоцнік на 25.000 насельніцтва. У гарадох з меншым лікам насельніцтва ўсе адно—1 сан. д. і памоцнік. Апрача агульнага санітарнага нагляду адчуваецца вострая патрэба ў спэцыяльных відах санітарнага абслугоўваньня па кватэрна-камунальнай, харчовай і прамысловай санітарыі, асабліва ў больш буйных гарадох (Менск, Віцебск, Гомель), што ў пяцігадовым пляне і прадугледжваецца. Па спэцыяльных відах мы вызначаем наступныя нормы абслугоўваньня: па харчовай і камунальна-кватэрнай санітарыі—па аднаму спэцыялістаму ў гэтых галінах на 50.000 гарадзкога насельніцтва, па п амысловай—1 на акругу.

Што датыча спэцыяльнага абслугоўваньня ў галіне эпідэміолёгіі, гэта зьяўляецца аднолькова важным для ўсіх гарадоў і мы лічым, што спэцыялістым у гэтай галіне павінен быць кожны акруговы санітарны доктар, які разам з бактэрыолёгічным аддзелам Сан.-Бакг. лябараторыі будзе ажыцьцяўляць гэту працу.

Цяпер кранем у кароткіх рысах тыя адзнакі, з якімі павінен быць шчыльна ўвязан плян пабудовы і палепшаньня санітарнае сеці. Першае, гэта адзнака эпідэмічнасьці рэспублікі, другое, пэрспэктыўны плян разьвіцьця народнае гаспадаркі, у прыватнасьці найбольш важных галін у санітарных адносінах, трэцяе, сучаснае палажэньне санітарнае організацыі ў адносінах задаваленьня патрэб санітарнага абслугоўваньня рэспублікі і, урэшце, можна сказаць самае галоўнае, фінансавыя магчымасьці.

Эпідэмічнасьць БССР, ня гледзячы на зьніжэньне яе, усё яшчэ застаецца значнай і няўстойлівай. Агульная эпідэмічнасьць у 1927 г. 381.2 : 10.000 насельніцтва. Эндэмічныя ачагі на некаторыя інфэкцыі ўвесь час пагражаюць эпідэмічнымі выбухамі, дзякуючы чаму мы па Рэспубліцы маем досыць высокія эпідэмічныя паказальнікі ў параўнаньні з іншымі Саюзнымі Рэспублікамі. Асабліва гэта датыча страўнакішэчных захворваньняў (брушны тыфус) і паразітарных тыфусаў (плямісты тыфус), як раз тых эпідэмічных хвароб, якія зьяўляюцца асноўнай адзнакай агульнага санітарнага дабрабыту і санітарнага становішча Рэспублікі, а па другое—той адзнакай, якая ўказвае на неабходнасьць больш шырокіх і рашучых супроцьэпідэмічных і агульнааздаравіцельных мерапрыемстваў. У 1927 годзе хваравітасьць на брушны тыфус мы мелі 6,4 на 10.000 насельніцтва, на плямісты 6,9 : 10.000. Праўда, гэтыя паказальнікі крыху ніжэй як у мінулым годзе (1926 г. брушны тыфус 7,1 : 10.000, высыпны 7,8 : 10.000) і шмат ніжэй як у гады вайны і разрухі, але не настолькі, каб было падобна на наступіўшы дабрабыт на гэтыя, здаўна пануючыя ў БССР, эпідэмічныя хваробы. Ня ў меншай меры таксама пагражаюць працоўным пануючыя сацыяльна-бытавыя хваробы, асабліва сухоты і трахома—больш глыбокі і цяжкі адбітак мінулага.

Сухоты ў 1927 г. па Рэспубліцы—122,5 : 10.000, трахома—76,3 на 10.000. Пры чым, паказальнікі на сацыяльна-бытавыя хваробы больш трывала трымаюцца за эпідэмічныя. Словам эпідэмічныя і сацыяльна-бытавых хвароб адзнакі высоўваюць ясныя і вялікія задачы, з якімі павінен быць увязан пэрспэктыўны плян пабудовы ня толькі санітарнае сеці і НКАЗ у цэлым, але гэтыя задачы—санітарнага аздараўленьня працоўных павінны быць увязаны і з іншымі галінамі пляваваньня савецкага будаўніцтва, асабліва на вёсцы.

Пераходзім да адзнак пэрспэктыўнага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі, з якімі мы павінны ўвязаць плян пабудовы санітарнае

арганізацыі. Тут мы закранем толькі тыя галіны народнае гаспадаркі, якія ў санітарных адносінах зьяўляюцца найбольш важнымі і якія нараўне з іншымі галінамі рэгуляваньня іх патрабуюць санітарнага рэгуляваньня і сталага нагляду.

Найбольш важныя галіны ў санітарных адносінах разьвіцьця народнае гаспадаркі, паводле папярэдніх даных Дзярж. пляну БССР на 5 год (1927-28—1931-32) выяўляюцца ў наступным:

а) Новае кватэрнае будаўніцтва ў 10 буйнейшых гарадох Рэспублікі павінна выявіцца ў стварэньні 798 тыс. кв. мэтр. жылой плошчы, у раённых гарадох і мястэчках—238,5 тыс. кв. мэтраў. Капітальныя ўклады ў кватэрнае будаўніцтва вызначаюцца ў 49.175 тысяч руб.

б) На камунальны дабрабыт вызначаецца 30 мільёнаў руб., з якіх 6.200 тысяч руб. на водазабясьпеку, 3.650 тыс. руб.—на каналізацыю і іншыя мерапрыемствы па ачыстцы гарадоў, 1.650 тыс. руб.—на санітарна-гігіенічныя мерапрыемствы (лазьні, прачашныя і інш.), 300 тыс. руб на дрэванасаджэньне.

в) Земляўпарадкаваньне, з якім зьвязана новае кватэрнае будаўніцтва і наогул перабудова вёскі, вызначаецца ў працягу 5 год скончыць поўнасьцю (да гэтага часу земляўпарадкаваньне выканана процантаў на 30). У агульным кватэрным будаўніцтве вызначаецца давесьці агнятрывалае будаўніцтва да 4%. Вялікія мерапрыемствы вызначаюцца па мэліарацыі і г. д.

г) Капітальныя ўклады ў прамысловасьць—на новае будаўніцтва, капітальныя рамонты і пашырэньне прадпрыемстваў вызначаецца агульнай сумай у 127,6 мільёнаў руб. Павялічэньне рабочай сілы ў прамысловасьці вызначаецца на 19.781 чал. (56,7%). Асабліва трэба ўвязаць плян санітарнае секцыі з найбольш важнымі ў санітарных адносін галінамі разьвіцьця прамысловасьці. У даным выпадку ў БССР найбольш важным зьяўляецца разьвіцьце харчовай прамысловасьці, у прыватнасьці мясной, малочнай і кансэрўнай (пераважна фруктаў). Тут трэба мець на ўвазе як якасьць прадукцыі (сыравіны і гатовых вырабаў) так і ўмовы вытворчасьці і ўплыў прамысловасьці на акружаючыя яе залюднёныя пункты. Павялічэньне ўсяе харчовае прамысловасьці ў даваенных рублёх вызначаецца на 103,5%, а рабочых на 54,1%. З іншых відаў прамысловасьці, маючай значэньне як у санітарных адносінах так і па свайму разьвіцьцю, трэба адзначыць хімічную прамысловасьць,—пераважна папяровая, сярніковая і шкляная.

Пагранічнасьць БССР і абавязкі паводле міжнароднай санітарнай канвэнцыі аб санітарнай ахове граніц таксама зьяўляецца сур'ёзнай адзнакай, якая павінна быць прынята пад увагу пры складаньні пяцігадовага пляну. Апрача азначанага ёсьць яшчэ шмат іншых момантаў культурнага адраджэньня і разьвіцьця БССР, з якімі павінен быць увязан плян і дзейнасьць санітарнае арганізацыі.

Як бачым задачы і патрэбы санітарнага абслугоўваньня Рэспублікі вялікія і з кожным годам будуць узрастаць. Нажаль, сёньня ня можна сказаць, што палажэньне і рост да гэтага часу санітарнае арганізацыі (гл. табл. № 1) адпавядаюць пастаўленаму перад ёй аб'ёму абслугоўваньня. Гэта ў роўнай меры датыча як якаснага так і колькаснага бакоў абслугоўваньня: Праўда, для гэтага ёсьць шмат аб'ектыўных прычын як мінулага так і сучаснага. Сучасныя прычыны, якія перашкаджалі разьвіцьцю санітарнае арганізацыі, пераважна грашовага характару. Гэта агульная балячка ў разьвіцьці маладой Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Паводле існуючага палажэньня аб санітарных органах, вызначаючага аб'ём і сфэру дзейнасьці іх і прымаючы пад увагу сучаснае палажэньне санітарнай арганізацыі, эпідэмічны стан Рэспублікі, разьвіцьце народнае гаспадаркі, у прыватнасьці найбольш важных у санітарных адносінах галін яе, зразумела і вынікаючыя з усяго гэтага задачы перад санітарнай арганізацыяй, а таксама фінансавыя магчымасьці,—НКАЗ вызначае наступны плян разьвіцьця санітарнае сеці (гл. табл. №№ 1 і 2).

Табліца 1

Пэрспэктыўны плян разьвіцьця санітарнае сеці на бліжэйшыя 5 год

Сетка	Сетка 1927-28 г	1928-29 год	1929-30 год	1930-31 год	1931-32 год	1932-33 год	Рост сеткі за 5 год	Патрэбная сетка
1. Санітарныя дактары:								
а) акруговыя	8	8	8	8	8	8	0	8
б) гарадзкія	15	19	21	23	24	26	+11	39
в) раённыя	19	35	56	76	96	101	+82	101
Усяго	42	62	85	107	128	135	+93	148
2. Памоцнікі сан. доктар.:								
а) у гарадох	2	5	9	12	15	19	+17	19
б) у раёнах	0	3	6	8	10	11	+11	101
Усяго	2	8	15	20	25	30	+28	120
3. Мэдпэрсан. д-прышчэпак:	0	10	20	30	50	50	+50	101
4. Інстытуты	3	3	3	3	3	3	0	3
5. Сан. Бакт:. Лябараторыі:								
а) акруговыя	7	7	7	7	7	8	+ 1	8
б) раённыя	3	4	5	7	9	11	+ 8	93
Усяго	10	11	12	14	16	19	+ 9	101
6. Пастэраўскія станцыі:	3	3	3	3	3	3	0	3
а) „ раён. пункты	35	36	37	38	39	40	+ 5	50
Усяго	38	39	40	41	42	43	+ 5	53
7. Дэзстанцыі ў акр. гар.:	5	6	7	8	8	8	+ 3	8
дэзпункты „	2	1	0	0	0	0	– 2	—
„ раённыя	3	5	7	9	15	21	+18	93
Усяго	10	12	14	17	23	29	+21	101
8. Малярыйная станцыя	1	1	1	1	1	1	0	1
9. Дамы Санасьветы Акр.	3	4	4	4	4	5	+ 2	8
выстаўкі-перасоўкі	0	0	1	2	2	3	+ 3	21
Усяго	3	4	5	6	6	8	+ 5	29

Табліца 2

Разьмеркаваньне росту сеці па акругах

			Бабруйск. акруга	Віцебск. акруга	Гомельск. акруга	Менская акруга	Магілеўск. акруга	Мазыр. акр.	Аршанск. акруга	Полацкая акруга	Усяго
1	Сандактары . .	у гарадох	1	3	2	3	1	—	1	—	11
		у раёнах	9	9	11	14	12	8	12	7	82
2	Памоцнікі .	у гарадох	2	3	3	4	1	1	2	1	17
		у раёнах	2	1	1	2	1	1	1	2	11
3	Мэдпэрсанал д прышч. у раён. .		5	5	6	6	6	8	6	8	50
4	Сан. Бакт Лябараторый гор. .		—	—	—	1	--	—	—	—	1
		раённыя .	1	1	--	2	1	1	1	1	8
5	Пастэраўскія пункты раённыя .		–	5	—	—	—	—	—	—	5
6	Дэзстанцыі ў гарадоў . .		1	—	—	—	—	1	1	—	3
7	Дэзпункты ў раёнах .		2	1	2	3	3	3	2	2	18
8	Дамы санасьветы ў гарадох . .		1	1	—	—	—		—	—	2
9	Выстаўкі-перасоўкі ў гарад. . .		—	—	—	—	—	1	1	1	3

Увага: пад гарадамі ў даным выпадку трэба разумець акруговыя гарады.

Як бачым з гэтых табліц, нават у канцы пяці год санітарная сетка далёка яшчэ адстае ад патрэбнае сеткі. Пры вызначэньні пашырэньня сеткі мы маем на ўвазе адначасова палепшаньне існуючае, на што таксама патрэбны сродкі, а гэтыя сродкі як раз з аднае кішэні. Трэба браць курс на якасьць сеці і працы, ад чаго ў асноўным залежыць аўтарытэт і вынікі працы санітарных органаў.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на абсталяваньне санітарных устаноў, падрыхтоўку і кваліфікацыю сан. дактароў, у прыватнасьці ў галіне кватэрна-камунальнай, харчовай і прамысловай санітарыі і на павялічэньне зарплаты. Усё гэта павінна быць прадугледжана ў плянавым каштарысным парадку.

Паступовасьць росту і тэрыторыяльнае вызначэньне санітарнае сеткі павінна быць увязана з тэмпам росту наогул і тэрыторыяльнымі адзнакамі ў прыватнасьці разьвіцьця народнае гаспадаркі, асабліва ў галіне маючай важнае санітарнае значэньне, з тэрыторыяльнымі адзнакамі эпідэмічнасьці, з пагранічнымі адзнакамі асобных акруг і наогул з адзнакамі важнасьці таго ці іншага залюдненага месца ў агульным жыцьці Рэспублікі. Пры складаньні пляну і разьмеркаваньні сеткі па акругах усё гэта намі прынята пад увагу.

Утрыманьне і пабудова санітарнае сеці як гарадзкой так і раённай павінна праходзіць па мясцовым акруговым каштарысам. Па дзяржаўнаму каштарысу трэба трымаць толькі тыя ўстановы і праводзіць тыя мерапрыемствы, якія маюць агульна рэспубліканскае значэньне. У даным выпадку ў нас мы лічым утрымаць па дзяржаўнаму каштарысу з Інстытуты—Мікрабіолёгічны, Сан.-Гігіенічны і Сацыяльнае Гігіены, 2 акруговых Сан.-Бакт. лябараторыі (першае катэгорыі.—Віцебск, Гомель) малярыйную станцыю, запасны эпідфонд на датацыю акругам у часе вялікіх эпідэмічных выбухаў (для плянавае дзейнасьці па барацьбе з эпідэміямі павінны быць створаны мясцовыя эпід. фонды), фонд для плянавых у рэспубліканскім маштабе навуковых досьледаў і вынаходжваньняў і ўрэшце, датацыйны фонд на ўтрыманьне санітарных дактароў у больш слабых у эканамічных адносінах акругах.

Перадаваць раённую санітарную сетку на раённы каштарыс, хоць гэта і адпавядае адміністрацыйна-гаспадарчым адзнакам іх, але зараз яшчэ зарана рабіць. Па-першае, каштарысы РВК слабы, а па-другое санітарная справа на вёсцы новая справа і пры ўсякім скарачэньні каштарысаў першай ахвярай будзе санітарная арганізацыя. Падобнае наогул адзначаецца.

Сетка лячэбна-прафіляктычных устаноў (дыспансэры) і заразных баракаў у плян пабудовы санітарнае арганізацыі намі ня ўключаецца. Згодна існуючага ў нас палажэньня ўся лячэбна-прафіляктычная сетка праходзіць па лініі лячэбна-прафіляктычнай часткі. Дзейнасьць санітарных органаў у асноўным складаецца з аздаравіцельных мерапрыемстваў акружаючых абставіны быту і працы працоўных. Зразумела дзейнасьць абедзьвёх арганізацый павінна быць шчыльна ўвязана і каардынавана. Падставы для пабудовы пляну лячэбна-профіляктычных устаноў і санітарнае сеці па змаганьні з сацыяльна-бытавымі заразнымі хваробамі ўжо адзначаны вышэй.

У раёнах, дзе мы яшчэ ня маем сеці санітарнае арганізацыі, санітарная праца па меры сіл і кампэтэнцыі павінна ажыцьцяўляцца раённым мэдпэрсаналам пад агульным кіраўніцтвам гэтай працай акруговага санітарнага доктара.

Урэшце трэба адзначыць, што вызначанае НКАЗ БССР на бліжэйшыя 5 год санітарная сетка зьяўляецца мінімальнай у адпаведнасьці з патрэбамі. На наступныя 5 год застаецца яшчэ вялікая задача ў разьвіцьці і палепшаньні санітарнае справы ў Рэспубліцы.

Зараз вызначаную сетку і палепшаньне існуючае ўсімі мерамі і сіламі як у цэнтры, так і на мясцох трэба ажыцьцявіць. Выдаткі на санітарную арганізацыю, а бяз іх ня можна спадзявацца на ажыцьцяўленьне вызначанага, павінны быць павялічаны як у абсалютных лічбах, так і па ўдзельнай вазе ў агульных каштарысах органаў аховы здароўя, асабліва ў найбольш адсталых у санітарнай справе акругах.

Санитарное состояние Бобр. Округа и оздоровительные мероприятия за 25—27 годы[1])

Л. Гурвич

Санитарная диагностика, т. е. выявление санитарной статики и динамики является чрезвычайно важным моментом в деятельности санитарной организации. Важно и интересно каждому работнику на ниве здравоохранения и особенно санитарному врачу в любой данный момент определить, осмотреться, учесть совокупность всех санит. улучшений, которые выражаются в целом ряде санит. показателей, из которых важнейшими по мнению Сысина являются:

1) Данные по естественному движению населения (рождаемость, смертность, смертн. грудн. детей до 1 г., естеств. прирост), 2) Данные о заболеваемости, 3) Данные по физич. развитию населения, 4) Данные о санит. состоянии населен. мест (благоустр., постановка санит. дела).

В отношении Бобр. Округа приходится базироваться на некоторых довоенных данных, которые удалось добыть с трудом и данных последних нескольких лет.

Конечно, санитарное состояние б. Бобруйского уезда не является идеалом, но все же известное сравнение с настоящим положением сделать можно, к тому же другой единицы, с чем сравнивать, у нас нет.

Население Бобр. Округа на 1 января 1927 года составляло 529,277 чел. (без присоед. районов Слуцк. Округа), из них мужчин 264.360, женщин—264.917 (в б. Бобр. уезде по переписи 1897 года 255.387 челов.), т. е. почти одинаковое количество мужчин и женщин. Вся эта масса населения расселена на территории в 14231 кв. килом. (против б. уезда более на 2000 кв в.), давая плотность населения в 37,1 на 1 кв. кил. (в 1925 г.—35,8).

Поверхность округа ровная, низменная, лесистая и болотистая. Почва почти сплошь песчано-глинистая и до того пропитана влагой, что Наполеон назвал грязь в местном крае „пятой стихией". Вот, как характеризует этот край польский писатель Крашевский: „Край покрытый лесом и болотами, с бедным народонаселением, грязными, оборванными жидами, отвратительными полуразвалившимися корчмами, греблями, по которым едешь и дрожишь от страха, леса мрачные, сосны тощие и кривые, стелющие коренья по земле, поперек дороги; иногда крест на распути; маленькая, покривившаяся церковь,—вот предметы, утомляющие взор путешественника. В деревне нищета, избы до половины в земле; народ худой, желтый, прокоптившийся в дыму, дети с всклокоченными волосами и полунагие". Это было написано в 50 годах прошлого столетия, правда многое в благоустройстве деревни изменилось, но многое верно и сейчас.

Населениe округа смешанное—белоруссы, евреи, русские, поляки и латыши

[1]) Доклад, читанный на с'езде Зав. лечучр. Бобр. Окр. 7—9 янв. 1928 г.

Что касается естественного движения населения, то оно дает след. картину (за 80 лет):

	Годы	Смертн. на 1000 нас.	Рождаемость на 1000 нас.	Смертн. детей до 1 года на 100 род.	Естеств. прирост
Б. уезд	1848-1858	47	64,8		17,8
	1870-1880	35,1	56,6		21,5
	1898	20,5	42,5		22,0
	1899	22,6	47,9		25,3
	1908	20,5	43,0	15,8 в Мин. г.	22,0
	1910	19,0	43,9	14,91 в (Б. у.)	24,9
	1923	14,3	41,4	10,5	27,1
	1924	15,5	43	9.6	27,5
Б. округ	1925	17,4	42,3	12,4	24,9
	1926	14,5	39,6	10,5	24,9

К сожалению, нет совершенно сведений за г. г. войны; возобновляются сведения с 1923 года. В общем цифры смертности за 80 лет дают снижение более, чем в три раза.

Конечно, в тесной связи стоит смертность до 1 года. В Бобр. округе смертность детей до 1 года с 1910 года тоже дает снижение, давая 10,5 на 100 родившихся, т. е. наравне с Анг., Францией, Японией, но, конечно, выше Н.-Зеландии 4,6, Швеции, Австрии, Голландии. Конечно главную роль здесь играет низкий уровень санитарной культуры. И прав д-р. Курош, когда говорит, что едва ли можно оспаривать, что в стране, где мала ценность жизни вообще, не может высоко цениться в народном сознании и жизнь ребенка. С большим правом можно утверждать, что насколько хорошо в стране санит. положение детей, настолько хорошо здоровье и положение всего общества. Улучшение в общем состоянии страны тотчас сказывается на улучшении здоровья детей, на уменьшении смертностей. При всех несчастьях (эпидемии, эконом. кризис) население страны несет обильную дань грозному и неумолимому закону в виде гетакомб детских жизней. Конечно, падение смертности связано у нас с общим улучшением экономического положения и отчасти культурного. Показателем последнего может служить хотя бы тот факт, что в 1897 по Бобр. уезду число грамотных на 1000 населения приходилось 156 челов., в 1925 году по Бобр. округу—238 челов.

Рождаемость в Бобр. округе (см. таблицу) пала больше чем в $1^1/_2$ раза, но, конечно, в более культ. странах она пала еще резче и стоит ниже чем у нас, напр., в Бобр. округе в 1923 г.—41,4, а в Швеции в 1922 г.—21, Англии—21,6, Франции—17,9.

Естественный же прирост населения в Б. окр. непрерывно растет, давая в 1848—1858 г.—17,8, а в 1926—24,9 т. е. падение смертности более резко, чем падение рождаемости. Страны Зап. Европы дают более низкий прирост населения (зависящий от меньшего количества рождений), а именно в 1922 г. Италия—12,9, Англия—9,0, Швеция—7,8.

В отношении естеств. движения по Белоруссии цифры по Бобр. округу дают более благоприятную картину.

	Рожд.		Смертн.		Смертн. до 1 года		Ест. прирост	
	Вся Белор.	Бобр. окр.	Вся Белор.	Бобр. окр.	Вся Белор.	Бобр. окр.	Вся Белор.	Бобр. окр.
1923	37,4	41,4	13,3	14,3	около	—	24,1	27,1
1924	38,8	43	15,1	15,5	12,0	—	23.7	27,5
1925	41.0	42,3	18,6	17,4		—	22.4	24,9
1926	—	—	—	—		10,5	—	—

Заболеваемость населения.

„Цифры заболеваемости есть вернее цифры обращаемости в лечебные учреждения, ибо полная регистрация заболеваний невозможна и недостаточна“ (Сысин).

Цифр общей заболеваемости у нас не было и потому мы останавливаемся на цифрах острозаразных заболеваний, социальных (туб., сифил., трах., чесотка), отчеты по которым представляются регулярно всеми лечучреждениями.

Вот цифры эпидемических заболеваний за послед. годы:

		Острозаразные		Туберкулез и сифилис	Парша, чесотка	Трахома	Всего
Общая заболеваемость				нет свед.	нет свед.	нет свед.	—
Бобр. уезд	1922 год . . .	5324		3164	3345	1454	17305
	23/24 „ . . .	9342		6913	10595	4307	35367
Бобр. округ	1925 „ . . .	1352	(без грип.)	7256	10036	3096	26630
	1926 „ . . .	6248	„	—	—	—	—
	1927 „ (Вместе со Слуцк. окр.)	7209	,,	8407	8876	2456	26943

Цифры острозаразных заболеваний дают снижение и абсолютно и относительно (учитывая укрупнения Бобр. округа вначале присоединением частей б. Рогачевского и Игуменского уездов, а в 1927 г. 5 районов Слуцкого округа). Цифры острозаразных заболеваний по сравнению с цифрами других заболеваний являются наиболее правильными, ибо они ведутся по карточной системе. Цифры-же социальных и бытовых заболеваний менее точны (на них карточки не заполняются), но известное сравнение в течение целого ряда лет произвести можно, поскольку условия регистрации в течение этих-же лет остались без изменения. Цифры трахомы, чесотки и парши дают к 1927 году некоторое снижение, туберкулез и сифилис—незначительный под'ем, очевидно тоже благодаря увеличению населения округа за счет присоед. района Слуцка.

Картина острозаразных заболеваний представляется в следующем виде:

	1922 г.	23-24	1925	1926	1927
Сыпной тиф . .	2460	677	862	316	418
Возвратн. „ . .	1752	724	68	11	12
Брюшн. „ . .	516	310	709	595	449
Неопред. „ . .	288	—	71	62	36
Дизентерия .	—	224	716	242	309
Оспа . . .	19	12	24	1	13
Дифтерит . . .	100	244	492	434	528
Скарлатина . . .	189	192	1063	1627	1999
Малярия . . .	—	873	1226	882	897
Корь	—	396	5352	642	548
Коклюш . . .	—	618	882	1436	2000
Грипп	—	5072	13327	14270	17001
Сифилис . . .	—	410	348	386	450
Туберкулез . .	—	2754	6565	6870	7957
Трахома . . .	—	1454	4307	6690	2456

Бобруйский округ и после падения эпидемич. волны в годы гражд. войны (о чем, к сожал., цифров. данных нет) и сейчас имеет целый ряд эпидемич. очагов, которые порой мелкими вспышками или искорками в виде единичных заболеваний дают знать о себе, грозно напоминая, что пора эпидемий еще не миновала, и что в благоприятную минуту можно получить эпидемич. стихийное бедствие.

В отношении паразитарных тифов (возвр. и сыпн. тиф.) мы имеем по Бобр. округу резкое снижение за последние годы (абсолютн и относит.), а именно в 1922 году—72,7 сыпного тифа на 10.000 населения, в 1925 г.—19,3, в 1926—6,0. Возвратный тиф дает еще более резкое снижение в 1922—52,9, в 1925 г.—1,4, в 1926—0,2 на 10.000 населения. В отношении параз. тифов, особенно выделяются Кличевский и Бобр. районы.

Заболевания оспой резко снижаются с 0,6 к 10.000 насел. 1922 г. до 0,1 в 1925 и до 0,02 в 1926 г. Правда с 1927 г., мы имеем некоторый под'ем, но он относится исключительно к присоед. району Слуцкого округа. Благодаря огромной работе по вакцинации насел. Бобр. округа за последн. 3 года, мы имеем большой успех. В отношении заболев. оспой, Бобр. округ в лучшем положении по отношению к средней заболеваемости оспой по Белоруссии, ибо по Белоруссии оспа дает—0,5, а по Бобруйскому округу—0,1.

В отношении кишечных инфекций, находящихся в тесной связи с вопросами благоустройства, хотя и имеется снижение, но положение далеко не благополучно. Так по Бобр. округу:

в 1925 году на 10.000 населения заболев. брюшн. тифа было 16,8, дизентерии—14.9
1926 „ „ „ „ „ „ „ 11.4 „ — 4,6

В отношении брюшного тифа имеется целый ряд постоянных очагов, связанных с неблагополучием в вопросах водоснабжения и канализации.

Наиболее неблагополучные Рогачевский, Жлобинский, Свислочский, Глуский и Бобруйский районы, а из вновь присоединенных—Любаньский район в селах, расположенных по берегам рек.

В отношении малярии заболеваемость наибольшая в Жлоб., Парич., Рогач районах и Любанск., т. е. в местах наиболее близких к болот. местности б. Минск. губ.

Действие инфекции (скарлатина, корь, дифтерит, коклюш) является постоянным грозным бичом детского населения за последние годы. Заболевания корью и дифтерит. дают за последние 2 года снижение, а скарлат. и коклюш резкое увеличение, о чем говорят следующие цифры:

	1925 г.		1926 г.
	Бобр. окр.	Белоруссия	Бобр. окр.
Скарлат.	22,0	33,5	30,7
Дифтерит.	10,2	9,2	8,2
Коклюш	18,3	—	27,1
Корь	111,0	70,6	12,1

Итак в отношении острозаразных заболеваний, мы имеем снижение острозаразных заболеваний за исключением детских инфекций.

Парша и чесотка чрезвычайно распространены у нас в округе и обнаруживают слабую тенденцию к снижению.

Основная причина—некультурность населения и связанная с этим слабость гигиенических навыков. Немаловажную роль играет здесь и плохое состояние или вернее почти полное отсутствие сельских общественных бань.

Абсолютное количество туберкулезных и сифилитических заболеваний растет из года в год по Бобр. округу, трахома дает 1927 г. маленькое снижение.

	На 10.000 населения		
	Туберк. заб.	Из них легочн. туб.	Сифилис
В 1925 году было	136,7	92,0	7,3
„ 1926 „ „	132,1	105,4	5,5

т. е. относит. туберкулез и вензаболев. дают снижение.

Показателем санитарн. состояния Бобр. округа может служить физич. развитие населения. В данном случае, мы пользуемся показателем физич. развития рабочих подростков за 1926 год на основании антропометр. измерений:

мужчины:

	Рост			Вес			Об'ем груди		
	Норма	Рабоч. подр.	Физкульт.	Норма	Рабоч. подр.	Физкульт.	Норма	Рабоч. подр.	Физкульт.
15 лет	155	153,3	155	43,6	45,8	51,5	77,4	75,8	76
16 „	159	155,7	155,1	49,7	47,7	47	80,3	77,1	77,5
17 „	163	158,9	157,0	52,8	51,9	53	82,5	79,4	79
18 „	166	161,6	161,7	57,8	50,6	56	84,2	81,4	82,5
19 „	167	162,3	165	60	56,1	60,9	84,6	83,2	85

Женщины:

	Рост			Вес			Об'ем груди		
	Норма	Рабоч. подр.	Физк.	Норма	Рабоч. подр.	Физк.	Норма	Рабоч. подр.	Физк.
15 лет . .	150	148,2	150	40,4	47,1	46	73,7	74,4	74
16 „ . .	153	153,6	150	43,6	50,0	48,1	76,9	76,8	74,1
17 „ . .	155	151,8	152,5	47,3	51,1	50,6	78,7	76,8	74,5
18 „ . .	156	151,6	151	51	52,4	53,0	79,7	78,1	77
19 „ . .	157	150,7	151,5	52,3	53,3	54,0	80,3	78,3	78

Сравнение антропометрич. данных указывает, что в отношении роста и об'ема груди не только рабочие подростки, но даже физкультурники, физич. развитие которых лучше, стоят ниже нормальных величин. Такое же соотношение существует и по отношению школьников.

И так, хотя за последние годы имеется целый ряд достижений в санит. состоянии Бобр. округа (эпидем. естеств. движ. населения), но все же положение продолжает оставаться тяжелым. Коренным злом является санитарное неблагоустройство округа. Водоснабжение из шахтных или трубчатых колодцев, самое примитивное, артезианские колодцы (и то в городах) насчитываются единицами. В отношении удаления нечистот, не только села, но и города, не говоря уже об ассениз. полях, не имеют обычных свалочных мест. Система вывозки нечистот бочечная, ассобоз имеется только в Бобруйске, порой нечистоты закапываются во дворе. Обществ. уборных в округе нет.

Жилищное дело только дополняет общую тяжелую санитарную картину. В городе Бобр. миним. норма—1,1 кв. саж. на человека, на селе—крестьянская хата со всеми ее „прелестями"—низкий потолок, порой отсутствие пола, малое количество света, отсут. форточек, обычай держать животных в хате и в добавок огромная русская печь со всеми ее санит. недостатками. Санит. состояние школ в городах и в округе тоже чрезвычайно плохое из-за колос. перегрузки помещений, а порой вообще из-за занятий в неприспособ. зданиях.

Другие виды благоустройства—замощение улиц, постройка мостов, дорог, насаждение зеленой площади—(только в этом году принявших несколько большие размеры)—все еще недостаточно и население многих сел порой утопает в грязи. Положение банного дела тоже очень плохое (см. выше). Вдобавок ко всему санит. врачей—проводников и руководителей санит. работы—еще очень мало и санитарная организация еще слаба. Да и ассигнования на санит. организацию и санит. мероприятия еще слабы и малы по сравнению с требованиями и нуждами жизни.

При таком санитарном сравнительно тяжелом положении Бобр. округи требуются большие оздоровительные мероприятия, большего размаха санит. реформы, большие средства, чтобы действ. помочь той культурной революции, которая проводится и должна быть проведена на селе.

Начались ли уже эти крупные оздоровительные мероприятия? Да, начались. Вот наиболее крупные данные, которые проходят при тесном контакте органов Комхоза, Зем. органов и санорганизации:

а) *в отношении водоснабжения:* постройка водопровода в Бобруйске, постройка бетонных колодцев на селе (в 1926-27 г. выстр.—256 бет. колод.), проведены большие гидротехнич. работы, проводится изучение малярийных очагов и очагов заболев. брюшного тифа;

б) *в отношении жилищ. дела:* начало крупного жилищного строительства: по линии Жилкооперации выстроен в городе и округе за 2 года—90 кв., приступлено к постр. на 42 квар. 3 этажн. дома, и ремонт почти всех жилищ-арендных домов; по линии Комхоза—постройка вторых этажей на 2-х зданиях и мелкий ремонт целого ряда домов; по линии Земотдела—выстроено 8 огнестойк. домов, распланировано громадное количество новых поселков, открыты 6 бетон. мастерских; по линии школьн. строительства—проводится строительство 23 двухкомп. школ. и ремонт старых школ, строятся 4 новые больницы, выстроены 3 бани в сельских местностях, 3 ветлечебницы, 2 агропункта.

Таблица 6

Пораженный орган	Abs		В % % По БССР	В % % СССР за 1923 г.
Голова	7+34=41		9,4	8,9
Правая рука	10+15=25	68	15,5	14,5
Левая рука	12+23=35			
Обе руки	—			
Не указ. руки	3+ 5= 8			
Пальцы правой руки	12+42=54	104	23,8	27,5
Пальцы левой руки	12+30=42			
Пальцы обоих рук	1= 1			
Не указ. какие пальцы	1+ 6= 7			
Правая нога	8+44=52	152	34,8	38,1
Левая нога	13+51=64			
Обе ноги	3+ 3= 6			
Не указ. ноги	11+19=30			
Туловище	26+40=66		3	11
Не указано	1+ 5= 6		1,2	—
Всего	437		100	100

В общем данные о поражаемости отдельных органов поранениями и ушибами в Белоруссии мало отличаются от данных по СССР. Значительная разница имеется в отношении ожогов. Повидимому, она зависит от различия в преобладающих причинах ожогов.

Если при поранениях и ожогах, главным образом, связаны руки, то при ушибах первое место по пораженности занимает нижняя половина тела—ноги и туловище. Довольно значительное число ушибов головы. Вследствие значительного числа случаев, при которых не указана какая рука или нога пострадала, трудно вывести заключение о сравнительной частоте их повреждения.

Переломы и раздробления костей поражают следующие органы:

Таблица 7

Пораженный орган	A b s	В °/₀ °/₀	
		По БССР	СССР
Голова	+ 2= 2	—	3,2
Правая рука	1+ 3= 4	8	13,1
Левая рука	1+ 1= 2		
Обе руки	—		
Не указ. руки	1+ 1= 2		
Пальцы правой руки	1+ 3= 4	9	14,8
Пальцы левой руки	1+ 3= 4		
Пальцы обоих рук	—		
Не указано	+ 1= 1		
Правая нога	4+11=15	34	55,7
Левая нога	4+12=16		
Обоих ног	1+ 2= 3		
Не указано	—		
Туловище	3+ 5= 8	—	13,1
Не указано	—	—	—
Всего	—	61	100

Выводы очевидны и чаще всего перелому подвергаются ноги.

Вывихи по органам распределяются следующим образом:

Таблица 8

Пораженный орган	A B S		В °/₀ по БССР
Правая рука	1+3=4	8	57,2
Левая рука	1+3=4		
Пальцы левой руки	1=1		7,1
Правая нога	2=2	4	28,6
Левая нога	1=1		
Не указан. ноги	1=1		
Не указано	1=1		7,1
Всего	14		100

Если свести все данные о распределении повреждений по органам, то получится следующая таблица:

Таблица 9

Пораженный орган	Поранение		Ожоги		Ушибы		Переломы и раздроблен.		Вывихи		Засорение		Обрезаны и отрублены		В с е г о	
	abs	%	abs	%	abs	%	abs	%	abs	%	abs	%	abs	%	abs	%
Голова . . .	42	6,4	8	1,7	41	9,4	2	3,3							93	5,6
Правый глаз . .	4										3				7	
Левый глаз . .	6 } 12	1,8	} 7	1,5							1 } 8	100			7 } 27	1,7
Оба глаза . . .	—															
Не указан. глаз . .	2		7								4				13	
Правая рука . .	60		353		25		4		4						446	
Левая рука . . .	55 } 130	19,8	63 } 425	90,6	35 } 68	15,5	2 } 8	13,1	4 } 8	57,2					159 } 639	38,4
Обе руки . . .	3		4		—										7	
Не указан. руки . .	12		5		8		2								27	
Пальцы правой руки .	155				54		4						12		225	
Пальцы левой руки .	177 } 352	53,7			42 } 104	23,8	4 } 9	14,8					7 } 19	100	231 } 485	29,1
Пальцы обоих рук .	2				1										3	
Не указ. как. рук. .	18				7		1								26	
Правая нога . .	51		7		52		15		2						127	
Левая нога . . .	42 } 111	17	7 } 18	3,9	64 } 152	34,8	16 } 34	55,7	1 } 4	28,6					130 } 319	19,2
Обе ноги . . .	3		1		6		3								13	
Не указ. ноги . .	15		3		30				1						49	
Туловище . . .	7	1	11	2,3	66	15,3	8	13,1							92	5,5
Не указано . . .	2	0,3	—	—	6	1,2			1	7,1					9	0,5
Итого . .	656	100	469	100	437	100	61	100	14	100	8	100	19	100	1664 +60 проч. 1724	100

Таким образом больше всего подвержены травмам руки и пальцы: третье место занимают—ноги, голова и туловище подвергаются одинаково часто, чаще всего повреждаются глаза. Если нельзя установить какую-нибудь существенную разницу в частоте повреждений правой и левой ноги или пальцев правой и левой рук, то совершенно отчетливо выделяется правая рука, которая в три раза чаще повреждается, чем левая.

Интересно выяснить, каким преимущественно повреждениям подвержены те или иные органы. Это видно из следующего сопоставления (сколько из ста повреждений той или иной части тела приходится на тот или иной вид).

Таблица 10

Пораженный орган		Поранения	Ожоги	Ушибы	Перел. и раздробл.	Вывихи	Засорения	Отрезан. отрыв.	Всего
Голова	abs	42	8	41	2	—	—	—	93
	%	45,2	8,6	44,1	2,1				100
Глаза	abs	12	7	—	—	—	8	—	27
	%	44,4	26				29,6		100
Руки	abs	130	425	—	68	8	—	—	639
	%	20,3	66,5		11,9	1,3			100
Пальцы рук	abs	352	—	104	9	1	—	19	485
	%	72,6		21,4	1,9	0,2		3,9	100
Ноги	abs	111	18	152	34	4	—	—	319
	%	35	5,6	47,6	10,5	1,3			100
Туловище	abs	7	11	66	8	—	—	—	92
	%	7,6	12	72	8,4				100
Итого	abs	654	469	431	61	13	8	19	1655
	%	39,5	28,3	26	3,8	0,8	0,5	1,1	100

Некоторая разница в распределении всех повреждений по их отдельным видам по сравнению с приведенными выше об'ясняется тем, что здесь мы исключили все прочие виды повреждений, числом не указанных.

Итак, мы видим, что голова подвергается по преимуществу поранениям и ушибам, глаза—поранениям, но не мало засорениям и ожогам: руки—ожогам, пальцы—поранениям, ноги—ушибам и поранениям, туловище—поранениям. Удельный вес других повреждений для каждого органа ясно виден по таблице.

Весьма важно также определить какие органы больше всего подвержены опасности несчастного случая в различных отраслях промышленности. С этой целью мы расположили наш материал следующим образом:

Таблица 11

Отрасли промышленности	Голова	Глаза	Руки	Пальцы	Туловище	Ноги	Всего
Стекольная промышленность	7+ 7=14	1+3=4	26+116=142	13+ 54= 67	2+11=13	11+51= 62	60+242=302
Деревообделочная промышленность	10+20=30	4+5=9	25+ 44= 69	55+141=196	10+13=23	30+81=111	134+304=438
Спичечная промышленность	2+ 5= 7	—	151+182=333	11+ 28= 39	+ 1= 1	6+ 9= 15	170+225=395
Писчебумажная промышленность	+ 6= 6	+8=8	6+ 23= 29	9+ 36= 45	3+ 8=11	5+26 = 31	23+107=130
Строительные работы	2+ 6= 8	+1=1	8+ 7= 15	15+ 13= 28	8+ 6=14	11+26= 37	44+ 59=103
Пищевая промышленность	1+ 1= 2	+1=1	5 + 7= 12	7+ 9= 16	5+ 4= 9	4+ 8= 12	22+ 30= 52
Текстильная промышленность	+ 7= 7	—	+ 4= 4	+ 20= 20	+ 4= 4	+ 2= 2	+ 37= 37
Металлообрабатывающая промышленность	+ 4= 4	1=1	4+ 2= 6	1+ 6= 7	+ 1= 1	2+ 5= 7	8+ 18= 26
Кожевенная промышленность	+ 2= 2	—	3+ 7= 10	1+ 9= 10	+ 1= 1	—	4+ 19= 23
Лесоразработки	+ 4= 4	—	+ 1= 1	1+ 3= 4	+ 6= 6	1+ 14= 15	2+ 28= 30
Белпогруз	+ 1= 1	—	1+ 3= 4	+ 8= 8	+ 3= 3	+ 12= 12	1+ 27= 28
Кирпичные заводы	1= 1	—	1+ 3= 4	2+ 1= 3	3+ 1= 4	3+ 2= 5	10+ 7= 17
Электростанц.	+ 4= 4	—	—	+ 3= 3	1= 1	—	1+ 7= 8
Кочегары	1 + 1= 2	1+1=2	1+ 6= 7	+ 8= 8	1= 1	1+ 5= 6	5+ 21= 26
Итого	=92	=26	=636	=454	=92	=315	=1615

В перечислении на %% отношения картина представляется еще более ясной, именно:

Таблица 12

	Голова	Глаза	Руки	Пальцы	Туловище	Ноги	Всего
Стекольн. промышл. . . .	4,6	1,3	47.3	22,3	4,3	20,2	100
Деревооб. „ . . .	6,9	2,5	15,7	44,7	5,2	25,0	100
Спичечн. „ . . .	1,8	—	84,3	9,9	0,3	3.7	100
Писчебум. „ . . .	4,6	6,2	22,3	34,6	8	24.3	100
Строит. раб.	7,8	0,9	14.6	27.2	13.5	36	100
Пищев. пром.	3,8	1,9	23.2	30,8	17,1	23.2	100
Текстил. „	19	—	10.8	54,1	10,8	5.3	100
Металлооб. пром. . . .	14	3,8	23,1	27,7	3,7	27,7	100
Кожевен. „	8,3	—	46	41,5	4,2	—	100
Лесоразраб. „	13,3	—	3,3	13,4	20	50	100
Белпогруз „	3,6	—	14,3	28.6	10.7	42,8	100
Кирпичн. зав.	5,9	—	23,5	18	23.5	29,1	100
Электростан.	50	—	—	37,5	12,5	—	100
Кочегары	8	8	28	32	—	24	100
В среднем . .	5,7	1,6	39,4	28,1	5,6	19.6	100

Приведенная таблица и дальнейшие данные требуют оговорки в том смысле, что выводы для отраслей промышленности, с небольшим числом несчастных случаев, разумеется, весьма относительны, но в общем она не нуждается ни в каких комментариях.

Если расположить все отрасли промышленности вокруг средних цифр, то мы увидим, что голова сравнительно часто поражается на электростанции, в текстильной промышленности, в металлообрабатывающей, на лесозаготовках, в кожевенной промышленности, у кочегаров на строительных работах, в деревообделочной промышленности; глаза сравнительно часто травматизируются у кочегаров в писчебумажной промышленности, в металлообрабатывающей промышленности; в деревообрабатывающей промышленности; травмы рук сравнительно часты в спичечном производстве, в стекольной и кожевенной промышленности; травмы пальцев—в текстильной промышленности, в деревообделочной, на электростанции; у кочегаров, в кожевенной промышленности, в писчебумажной и пищевой промышленности; повреждения туловища сравнительно часты на кирпичных заводах, на лесозаготовительных работах, в электростанциях, в пищевой промышленности, на строительных работах, в текстильной и писчебумажной промышленности; травмы ног встречаются довольно часто во всех отраслях, кроме текстильной и спичечной промышленности. Впрочем, практическое значение всех этих выводов заключается в выявлении того, каким органам наиболее угрожает в отношении травм в отдельных отраслях промышленности. Например, в спичечной промышленности наше внимание привлекает очень значительный процент рук среди травм органов в деревообрабатывающей и текстильной промышленностях, значительный процент травм пальцев, на лесозаготовительных работах обращает на себя внимание травмы ног, на электростанциях и лесозаготовительных работах значительное число травм головы и проч. Уже это одно наводит на ряд практических соображений и на дальнейшие исследования.

Отдельные отрасли промышленности отличаются друг от друга не только по сравнительной степени поражаемости органов, но и по характеру и типу повреждений. В самом деле отдельные отрасли промышленности по числу различных повреждений распределяются следующим образом:

Таблица 13

	Поранения	Ожоги	Ушибы	Перелом и раздробл.	Вывихи	Всего
Стекол пром. .	22+124=146	25+ 84=109	13+ 32= 45	+ 1= 1	—	301
Деревооб. пром.	70+172=242	1+ 2= 3	54+114=168	8+15=23	1+3=4	440
Спичечн. „ .	12+ 29= 41	148+179=327	8+ 17= 25	2= 2	—	395
Писчебум. пром.	8+ 38= 46	+ 11= 11	15+ 51= 66	+ 1= 1	+3=3	127
Строит. работ. .	29+ 32= 61	2+ 1= 3	10+ 22= 32	3+ 3= 6	+2=2	104
Пищев пром. .	12+ 10= 22	2+ 4= 6	7+ 12= 19	2+ 4= 6	—	53
Текстил. „ .	+ 17= 17	2= 2	+ 14= 14	+ 4= 4	—	37
Металлооб. пром.	3+ 8= 11	1= 1	3+ 7= 10	1+ 3= 4	—	26
Кожевен. „ .	2+ 12= 14	1+ 2= 3	1+ 5= 6	—	—	23
Лесозаг. работ. .	2+ 10= 12	—	+ 9= 9	+ 8= 8	+2=2	31
Белпогруз . .	1+ 2= 3	—	+ 23= 23	+ 2= 2	—	28
Кирпичн. зав. .	4+ 3= 7	—	6+ 2= 8	—	+2=2	17
Электростан. .	+ 5= 5	—	1+ 1= 2	+ 1= 1	—	8
Кочегары . .	2+ 7= 9	1+ 3= 4	1+ 9= 10	1+ 2= 3	—	26
Итого. .	636	469	437	61	13	1616

В процентных исчислениях получится такая таблица:

Таблица 14

	Поранения	Ожоги	Ушибы	Перелом и раздробл.	Вывихи	Всего
Стекольн. пром.	48,6	36,2	14,9	0,3	—	100
Деревооб. „	55	0,7	38,2	5,2	0,9	100
Спичечн. „	10,4	82,8	6,3	0,5	—	100
Бумажная „	36,2	8,7	52	0,8	2,3	100
Строительн. раб.	58.6	2,9	30,7	5,8	2	100
Пищевая пром.	41,5	11,5	36	11,2	—	100
Текстил. „	46	5,4	37,8	10,8	—	100
Металлообр. пром.	42,3	3,8	38,5	15,4	—	100
Кожевенная „	60,9	13	26,1	—	—	100
Лесозаг. раб.	38,7	—	29,1	25.8	5,4	100
Белпогруз	10,6	—	82,2	7,2	—	100
Кирпичн. зав.	41,2	—	47	—	11,8	100
Электростан.	62,5	—	25	12,5	—	100
Кочегары	34.6	15,4	38,5	11,5	—	100
В среднем	39,4	29	27	3,8	0,8	100

Таблица 15

Отрасли пром.	Исполнит. механизмы	Приводы	Ручная переноска тяжести	Вагонетки	Ручные инструменты	Расплавл. едких вещ.	Падение на рабоч. тяж. предметов	Падение самих рабочих	Падение на ровн. месте	Натыкание на предметы	Натыкание на острые предметы
Стекол. . . 238 – 50 = 188	+ 1 1	1=1	5+ 8=13	—	9+62=71	25+ 75=100	3+ 4= 7	2+2=4	4+15=19	+2=2	1+19=20
Деревообр. . 406—128=278	56+123=179	2+1=3	16+68=84	22+31=53	14+31=45	1+ 2= 3	15+11=26	1+3=4	—	1+5=6	+ 3= 3
Спичечн. . . 384—170=214	11+ 22= 33	+1=1	5+ 9=14	2= 2	2+ 5= 7	147+176=323	+1 = 1	+1=1	+ 1= 1	+1=1	—
Бумажн. . . 132— 26=106	8+ 28= 36	+1=1	5+28=33	1+ 5= 6	5+14=19	+ 9= 9	5+12=17	1+5=6	+ 2= 2	+2=2	+ 1= 1
Строительн. . 95 – 40= 55	+ 1= 1	—	6+11=17	+ 2= 2	14+23=37	2+ 1= 3	8+10=18	5+4=9	3+1= 4	+2=2	+ 2= 2
Пищевкусов. . 51— 22= 29	13+ 10= 23	3+2=5	+ 7= 7	—	5+ 1= 6	+ 3= 3	1+ 1= 2	+2=2	+ 2= 2	—	+ 1= 1
Металлическ. 24 – 7= 17	2+ 7= 9	—	2+ 4= 6	—	1+ 1= 2	+ 1= 1	1+ 4= 5	+1=1	—	—	—
Кожевен. . . 21 – 4= 17	—	—	+ 3= 3	—	2+ 5= 7	1+ 2= 3	—	—	+ 2= 2	+2=2	1+ 3 =4
Лесозагот. . 28 – 3= 25	+31 = 31	—	+ 5= 5	—	3+ 8=11	—	+12=12	—	—	—	—
Текстильн. . = 37	—	—	2+24=26	—	+ 2= 2	+ 2= 2	+ 1= 1	+1=1	—	—	—
Белпогруз. . 30 – 2= 28	—	—	—	—	+ 1= 1	—	+ 1= 1	—	+ 1= 1	+1=1	—
Кирпичн. . . 14– 11= 3	—	—	—	4+ 3= 7	+ 4= 4	—	+ 3= 3	—	—	—	—
Электрич. . 6— = 6	+ 2= 2	—	—	—	+ 1= 1	—	+ 3= 3	—	—	—	—
Кочегарка . 21— 4= 17	2+ 3= 5	2= 2	+ 4 =4	+ 1= 1	+3 = 3	+ 3= 3	+ 3= 3	—	—	—	—
Итого . .	320	13	212	71	216	450	99	28	31	16	31

На основании этой таблицы по сличению с предыдущей легко установить, какие повреждения наиболее распространены в той или иной отрасли промышленности. Для стекольной промышленности, например, наиболее характерны поранения и ожоги, для деревообделочной—поранения и ушибы, для спичечной—ожоги и т. д. Далее мы устанавливаем, что по сравнению с средними величинами, поранения наиболее распространены в кожевенной промышленности, на строительных работах, на электростанциях, в деревообрабатывающей промышленности, в стекольной промышленности и проч. Точно таким же образом определяется сравнительное значение и остальных повреждений для тех или иных отраслей промышленности.

При сопоставлении данных о распространении отдельных повреждений и о распространении травм отдельных органов по отраслям промышленности получается уже более или менее отчетливая характеристика последних в отношении промышленного травматизма. Так, по нашим данным деревообрабатывающая промышленность характеризуется сравнительно большим распространением поранения пальцев, спичечная промышленность — ожогами рук, стекольная промышленность—также ожогами рук, лесозаготовительная—ушибами и переломом ног и т. д. Как видно, эти данные в общем совпадают с тем, что известно об этом вопросе. Это, между прочим, служит лишним доказательством полной пригодности нзшего материала для поставленных нами целей.

Ради полноты характеристики отдельных отраслей промышленности приведем данные о том, какие материальные причины, главным образом, вызывают несчастные случаи в них (См. табл. 15).

Тоже в процентах:

Таблица 16

	Исполн. механизмы	Приводы	Ручн. переносн. тяж.	Вагонетки	Ручн. инструменты	Распл. едк. хим. вещ.	Паден на рабоч. тяж. пред.	Пад. сам. раб.	Пад. на ровн. месте	Натыкание на предметы	Натыкание на острые предметы	Итого
Стекольн. пром.	0,4	0,4	5,5	—	29.8	42,6	3,0	1,7	8,0	0,8	8,4	100
Деревообр. „	44,1	0.7	21,2	13	11,1	0,7	5	1,0	—	1,5	1,7	100
Спичечн. „	8,6	0,3	3,5	0,6	1,8	84,1	0.3	0,3	0,3	0,2	—	100
Бумажн. „	27,3	0,8	25	4,5	14,2	6,8	12,8	4,5	1,5	1,5	0,8	100
Строит. раб.	1,1	—	18	2,1	39	32	19	9,4	4	2,1	2,1	100
Пищевая пром.	45,1	9.8	13.7	—	12	6	3.8	3,8	3.8	—	2,0	100
Текстил. „	84	—	—	—	5.3	5.3	2,7	2,7	—	—	—	100
Металлооб. „	37.5	—	25	—	8.3	4,2	20,8	4,2	—	—	—	100
Кожевен. „	—	—	14.3	—	33.3	14,3	—	—	9,5	9,6	19	100
Лесозаг.	—	—	17,8	—	39,2	—	43	—	—	—	—	100
Белпогруз	—	—	86,8	—	4.4	—	4,4	—	4,4	4,4	—	100
Кирпич. зав.	—	—	—	50	28,6	—	21.4	—	—	—	—	100
Электрост.	33	—	—	—	16,7	—	50	—	—	—	—	100
Кочегары	23,8	9.5	19.0	4,8	14,3	14,3	14,3	—	—	—	—	100
В среднем	21,5	0,9	14,3	4,8	14.5	30,3	6,6	1,8	2,1	1,1	2,1	100

Внимательное чтение приведенной таблицы дает ответ на вопросы, какая материальная причина имеет наибольшее значение в отдельных отраслях промышленности (в стекольной промышленности—расплавление веществ, в текстильной промышленности—исполнительные механизмы, кожевенной—ручные инструменты и т. д.) и в какой отрасли промышленности наиболее распространена, по сравнению с

средними величинами, те или иные материальные причины (например, ручная переноска тяжестей — в деревообрабатывающей и бумажной промышленности, Белпогрузе, ручные инструменты — строительном, лесозаготовительном, стекольном производствах и т. д.). Иначе говоря, таблица дает также определенное практическое направление мероприятиям по борьбе с промышленным травматизмом по отраслям промышленности.

Попутно с приведенными данными представляет значительный интерес оценка „виновности“ в несчастных случаях. Наш материал охватывает в этом отношении 634 случая, которые распределяются так: из-за случайности 16 или 2,5%, из-за несовершенных способов работы 25 или 4%, по вине сотоварища по работе 40 или 6,3%, по вине администрации 176 или 27,8%, по вине пострадавшего 377 или 59,4%.

Эти сведения, таким образом, подтверждают установившийся, к сожалению, в литературе взгляд, будто в большинстве несчастных случаев виноваты сами пострадавшие. Мы не сомневаемся, что это есть плод какого то нелепого недоразумения, в которое впадают обычно все инспектора, расследующие несчастные случаи и дающие им оценки. По сути дела несчастный случай возможен только там, где имеется материальная причина и способствующие условия (общесанитарные, способ работы, состояние организма рабочих и усталости их, отсутствие мер предосторожности и предупреждений и т. д.), т. е. вины рабочего не может быть. Неосторожность рабочего не есть вина, а беда, последовавшая в результате указанных только что об'ективных причин. Упоминая об этом, мы отнюдь не исключаем роли и значения самих рабочих в происхождении и распространении несчастных случаев, но мы считаем, что эта роль и значение так сказать не индивидуальны, т. е. они не существенны при об'яснении отдельного несчастного случая, а очень важны в социально-гигиеническом и социально-техническом смысле. Половой и возрастной состав пострадавших, их стаж должны давать определенные указания на счет социальных мер, т. е. касающихся групп рабочих. К сожалению, мы уже указывали в самом начале этой работы, что наш материал не дает доброкачественного ответа на эти насущные вопросы, и мы вынуждены ограничиться попыткой осветить промышленный травматизм в Белоруссии только с точки зрения профессионального состава пострадавших, да и то только в некоторых отраслях промышленности, где отдельные профессии представлены более или менее значительным числом рабочих:

Таблица 17

В стекольной промышленности из	(50+246)	296	несч. случ.	100%
было среди баночников	(9+ 51)	60	„ „	или 20,3 „
„ „ стеклодувов . . .	(9+ 49)	58	„ „	19,6 „
„ „ шлифовщиков . . .	(+16)	16	„ „	5,4 „
„ „ чернорабочих . . .	(+14)	14	„ „	4,7 „
„ „ отшибальщиков . . .	(+11)	11	„ „	3,7 „
„ „ наборщиков . .	(+10)	10	„ „	3,4 „
„ „ прочих профессий . .	(32+ 95)	127	„ „	42,9 „
В деревообделочной промышленности из	(148+304)	452	несч. случ.	100%
было среди циркулярщиков . .	(17+ 39)	56	„ „	или 12,3 „
„ „ чернорабочих . . .	(11+ 27)	38	„ „	8,4 „
„ „ возчиков	(+17)	17	„ „	3,8 „
„ „ станочников	(13+ 18)	31	„ „	6,8 „
„ „ парщиков	(+15)	15	„ „	3,3 „
„ „ лупильщиков	(+12)	12	„ „	2,6 „
„ „ податчиков	(14+ 12)	26	„ „	5,8 „
„ „ рубщиков	(+11)	11	„ „	2,4 „
„ „ прочих	(93+152)	245	„ „	54,6 „

В спичечном производстве из	(174+228)	402	несч. случ.		100%
было среди упаковщиков	(139+179)	318	„ „	или	79,1 „
„ „ прочих	(35+ 49)	84	„ „		20,9 „
В текстильном производстве из	(+ 41)	41	несч. случ.		100%
было среди моточников	(+ 14)	14	„ „	или	34,1 „
„ „ прочих	(+ 27)	27	„ „		65 9 „
В бумажном производстве из	(+109)	109	несч. случ.		100%
было среди покатчиков	(+ 10)	10	„ „	или	9,2 „
„ „ прочих	(+ 99)	99	„ „		90,8 „
На строительных работах из	(45+ 63)	108	несч. случ.		100%
было среди плотников	(16+ 27)	43	„ „	или	39,8 „
„ „ чернорабочих	(20+ 14)	34	„ „		31,5 „
„ „ прочих	(9+ 22)	31	„ „		28,7 „
В Белпогрузе из	(+ 33)	33	несч. случ.		100%
было среди грузчиков	(+ 28)	28	„ „	или	84,9 „
„ „ прочих	(+ 5)	5	„ „		15,1 „

К сожалению, мы не можем вывести риска промышленного травматизма по отдельным профессиям, выведенные экстенсивные показатели распространения несчастных случаев по профессиям имеют, разумеется, весьма относительное значение, при этом значение отрицательное: мы не можем установить, за некоторым исключением, что среди каких-либо профессий несчастные случаи имеют сколько-нибудь особенно большое распространение по сравнению с другими профессиями.

Нам осталось еще привести данные о распределении несчастных случаев по дням недели:

Из (514+1199) 1713 несч. случ. на	воскресенье падает	(11+ 31)	42,
	понедельник „	(90+202)	292,
	вторник „	(97+209)	306,
	среду „	(87+195)	282,
	четверг „	(85+195)	280,
	пятницу „	(96+208)	304,
	субботу „	(48+159)	207.

Если принять число несчастных случаев в понедельник за 100, то в воскресенье происходит: 14,4 несчаст. случ.

„ понедельник	„	100	„	„
„ вторник	„	104,8	„	„
„ среду	„	94,2	„	„
„ четверг	„	93,5	„	„
„ пятницу	„	104,1	„	„
„ субботу	„	70,9	„	„

Найти какое-нибудь рациональное об'яснение такому распределению несчастных случаев по дням недели довольно трудно.

Этими данными исчерпывается материал о несчастных случаях за 1925-1926 г. г., на основании извещений, полученных органами НКТ. Уже указывалось в начале, что многие существеннейшие стороны, особенно-важные именно для социально-гигиенического освещения промышленного травматизма, остаются не затронутыми, но некоторые выводы можно сделать и без этого. Нам кажется особенно важным прежде всего подчеркнуть, что промышленный травматизм не является

каким то неизбежным злом, одним из проявлений природы промышленности. Эта истина давно установлена на основании многочисленных статистических наблюдений, но все еще слишком часто встречается мнение, что „известное“ количество несчастных случаев обязательно. Второй предрассудок, царящий в области промышленного травматизма,—это „вина рабочих“ в большинстве несчастных случаев. Строго говоря, нет ни одного несчастного случая, на который толкал бы рабочего кто либо, кроме его собственной неосторожности, но суть дела заключается: во-первых, в наличии об‘ективных возможностей несчастного случая, и, во-вторых, в том состоянии рабочего вследствие общих условий труда, которое притупляет его осторожность. Таким образом, и устанавливается связь между промышленной травмой, состоянием организма потерпевшего и общими условиями труда. Этим определяются и меры борьбы с промышленным травматизмом, общие основы которых достаточно известны: улучшение санитарного состояния пред приятия, и устранение непосредственных причин несчастных случаев, правильное распределение работы между рабочими, в зависимости от пола и возраста, квалификации и подготовки. Само собой понятно, что в отношении отдельных отраслей промышленности resp. отдельных предприятий конкретные меры в одном, другом, третьем или во всех направлениях могут быть разработаны лишь на основании специального изучения характера и распространения промышленного травматизма.

В частности, наш материал дает основание сделать такие выводы:

1. Большую часть несчастных случаев составляют поранения (38%), ожоги (27,2%) и ушибы (25%).

2. От поранения, главным образом, страдают пальцы рук (53,7%), от ожогов—правая рука (св. 79%), от ушибов—ноги (34,8%) и пальцы рук (23,8%), от переломов и раздроблений—ноги (55,7%), от вывихов—руки (57,2%).

3. Голова чаще всего поражается вследствие поранений (45,2%) и ушибов (44,1%), глаза вследствие поранений (44,4%), ожогов (20%) и засорений (29,6%), руки вследствие ожогов (66,5%), пальцы рук вследствие поранений (72,6%), ноги вследствие ушибов (47,6%) и поранений (35%), туловище—вследствие ушибов (72%).

4. Голова сравнительно часто подвергается в деревообделочной промышленности (6,9% всех несчастных случаев), на строительных работах (7,8%), в текстильной промышленности (19%), в металлообрабатывающей промышленности (14%).

Глаза—в деревооб. промыш. (2,5%), писчебумаж. (6,2%), металлоб. промыш. (3,8%);

руки—в стекольной пром. (47,3%), в спичечн. пром. (84,3%);

пальцы—в деревооб. пр. (44,7%), писчебумаж. (34,6%), пищевой (30,8%), в текстильной пром. (54,1%);

туловище—на строительных работах (13,5%), в пищевой (17,1%), в текстильной (10,8%);

ноги—в деревообр. промыш. (25%), писчебумаж. (24,3%), на строит. раб. (36%).

5. В стекольной промышленности наиболее распространены поранения (48,6%), в деревообд.—поранения (55%) и ушибы (38,2%), в спичечн. пром.—ожоги (82,8%), в бумажной пром.—ушибы (52%), и поранения (36,2%), на строительных работах—поранения (58,6%).

6. Главными материальными причинами несчастных случаев являются расплавленные химические вещества (30,3%), исполнительные механизмы (21,5%), ручные инструменты (14,5%), переноска тяжестей (14,4%).

7. Распределение несчастных случаев по дням недели не поддается рациональному об'яснению.

8. Сравнительный риск по отдельным профессиям на основании данного материала установить невозможно.

9. Основными мерами борьбы с несчастными случаями являются улучшение санитарных условий работы, распределение работы между соответствующими (по полу, возрасту, квалификации) рабочими и устранение непосредственной причины несчастных случаев (техника безопасности).

10. Конкретные меры для отдельных отраслей промышленности или предприятий могут разрабатываться лишь на основе детального изучения промышленного травматизма.

11. Данная работа, не давая ответа на многие существенные вопросы, дает соответствующее гигиеническое освещение промышленного травматизма, представляет собою исходный материал для дальнейшей разработки этой важнейшей темы гигиены труда и фиксирует внимание на некоторых практических вопросах борьбы с несчастными случаями в отдельных отраслях промышленности Белоруссии.

КЛИНИЧЕСКАЯ МЕДИЦИНА

Катэдра ортопэдыі БДУ і ортопэдычная амбуляторыя НКЗ Бел.

Аб прыраджоных зьвіхах лагво-бядровае суставы*)

Доцэнт М. Шапіра

Паважаныя таварышы! Перад тым, як перайсьці да асноўнай тэмы маей лекцыі, я дазволю сабе спыніцца ў некалькіх словах на сутнасьці ортопэдыі, як навукі, навукі яшчэ маладой, якая зусім нядаўна заняла месца сярод іншых дысцыплін, з якіх складаецца праграма мэдычнае адукацыі ў нашай вышэйшай навуковай установе.

Па меры таго, як пашыраецца скарбніца мэдычных ведаў, зьяўляюцца новыя дысцыпліны, якія ўзьнікаюць самастойна, альбо адшчапляюцца ад буйных, асноўных дысцыплін.

Усе яны могуць быць падзелены на 2 групы, якія значна адрозьніваюцца адна ад другой. Да першае групы належаць тыя навукі, якія разглядаюць чалавека, здаровага і хворага, наогул і з розных пунктаў погляду. Кожны новы погляд на яго—ёсьць дапаўненьне да вывучэньня і, таму, вельмі каштоўны. Гэтыя навукі зьяўляюцца, такім чынам, асноўнымі і прадстаўляюць фундамант для мэдычнага выкладаньня.

Яны не хаваюць у сабе небясьпекі вузкасьці поглядаў, строгай спэцыялізацыі, бо іх імкненьні маюць концэнтрычны кірунак; яны набліжаюцца адна да другой, каб разам дайсьці да вызначанай мэты—вывучэньню чалавека.

Да другой групы належаць дысцыпліны і спэцыяльнасьці, якія абмяжоўваюцца паасобнымі органамі цела чалавека і якія маюць у сваёй аснове такую складаную тэхніку, для аўладаньня і вывучэньня якой патрэбна шмат сілы, часу і энэргіі. Іх аснова—тэхніка, у адзнаку ад першых—чыста навуковых. Іх практычная неабходнасьць бясспрэчна. Але яны хаваюць у сабе небясьпеку аднабочнасьці, вузкай спэцыялізацыі.

Як паасобныя людзі глядзяць на гэтую небясьпеку—гэта іх асабістая справа. Адных вабіць да чыстай навукі, другіх—да прыкладной—да тэхнікі. Адны знаходзяць сваё здаваленьне ў вышэйшай, дасканалай тэхніцы, другія вывучаюць усё строга навукова. Так заўсёды было і ў гэтым няма нічога дрэннага. Абодвы гэтыя віды людзей прызначаны дапаўняць адзін другога.

Да якой-жа групы належыць ортопэдыя?

Яе можна адзначыць як навуку аб патолёгічнай мэханіцы чалавечага цела і як здольнасьць адхіляць і зьнішчаць усе парушэньні гэтай мэханікі.

Яе першай і самай важнай задачай зьяўляецца тое, што азначаецца словам „ортопэдыя", гэта значыць—выхаваньне цела. Таму яе аб'ектам зьяўляецца ў першую чаргу чалавек у часе яго росту.

*) Уступная лекцыя па ортопэдыі, якая была прачытана V курсу мэдфака БДУ 10 лютага б. г.

Яе другая задача—захаваньне чалавека, які расьце яго мэханічных функцый, а таксама і адхіленьне ўсіх калецтваў, якія могуць зьявіцца на працягу яго жыцьця.

Такім чынам, яна разглядае ўсяго чалавека ад нараджэньня і аж да сьмерці са сваіх уласна-орыгінальных пунктаў погляду і імкнецца пранікнуць у сутнасьць і вывучэньне мэханікі яго цела і ўладаць імі.

Якімі сродкамі яна гэтага дасягае—зьяўляецца пытаньнем другараднага парадку.

Такім чынам, мне здаецца, што ортопэдыя мае сваё месца сярод навуковых дысцыплін, а ня тэхнічных спэцыяльнасьцяй, бо яе сутнасьць азначаецца не якой-небудзь асаблівай тэхнікай, а тымі шляхамі, якія вядуць яе да вызначанай мэты—вывучэньня нармальнай і паталёгічнай статыкі і мэханікі чалавечага організму.

Па меры пашырэньня граніц кожнай галіны мэдыцыны, утвараюцца паміж імі сумежныя галіны, якія вымагаюць удзелу некалькіх дысцыплін для распрацоўкі тых ці іншых пытаньняў. У гэтых адносінах ортопэдыя па сутнасьці сваёй знаходзіцца ў заўсёднай і цеснай сувязі з нэўролёгіяй, пэдыатрыяй і хірургіяй.

Аднак зусім ня маюць рацыі некаторыя хірургі, асабліва на Захадзе, якія яшчэ нядаўна лічылі аддзяленьне ортопэдыі і імкненьне яе да незалежнай дысцыпліны, шкоднай для самой хірургіі.

Такі погляд меў месца і апраўданьне тады, калі прадметам вывучэньня быў кожны хворы орган паасобку, калі кожная хвароба разглядалася, як нешта самастойнае.

Зусім іншае мы бачым цяпер: сералёгія, імунытэт, унутраная сэкрэцыя адчыняюць новыя перспэктывы і шляхі вывучэньня чалавека. Навука аб констытуцыі прапануе разглядаць чалавека, як складаную біолёгічную адзінку, што ў корані зьмяняе ўсе даўнейшыя погляды на хваробу. Асабліва яскрава выяўляецца гэты погляд у ортопэдыі.

Арганізм чалавека пабудаваны з вялізнага мноства органаў і іх комплексаў, якія шчыльна злучаюцца паміж сабой. Вэгетацыйныя органы кіруюць чыста жывёльным жыцьцём; органы пачуцьцяў успрыймаюць знадворны мір; адзін комплекс органаў служыць выключна для падтрыманьня і руху цела; ён выразна вылучае чалавека, як асобу; ім чалавек карыстаецца для здабываньня пажывы, а таксама для абароны; ён адзін фізычна, але сумесна з разумовымі здольнасьцямі, забясьпечвае чалавеку ў псіхафізычным сэнсе яго высокае соцыяльнае становішча.

Тут з асаблівай яскравасьцю выяўляецца залежнасьць паміж біолёгічным і соцыяльным.

Усе галіны гэтага комплексу органаў руху маюць сваю актыўную крыніцу ў цэнтральнай нэрвовай сыстэме; цяглíцы зьяўляюцца маторамі, якія кіруюць усімі рухамі суставаў; усё разам—прадстаўляе сабою адну замкнутую фізыолёгічную статычна-дынамічную адзінку, у якой кожная частка залежыць адна ад другой; яе колькаснае значэньне вызначаецца тым, што адны толькі цяглíцы важаць больш трэці ўсяго цела, якаснае—што амаль увесь рухальны апарат можа быць спаралюжаваны і ад гэтага ня будзе ніякай шкоды іншым комплексам органаў.

Усе зьявішчы, якія парушаюць часова альбо надоўга гэты комплекс органаў руху, належаць да ортопэдычнай соцыял-біолёгіі.

Пакуль хвароба органаў руху знаходзіцца ў вострай стадыі, соцыяльныя вымогі чакаюць, пакуль хворы будзе біолёгічна выратаваны.

І толькі, калі хвароба мінула, пакінуўшы свае цяжкія разбурэньні, соцыяльна-біолёгічная думка выступае ва ўсім сваім аб'ёме, кіруючы ўсімі нашымі дзеяньнямі, якія імкнуцца да таго, каб з пакалечанага індывідуума зноў зрабіць соцыяльна-апраўданую істоту.

А калі прыняць пад увагу ортопэдычную профіляктыку, якая павінна быць добра вядома кожнаму ортопэду, то перад намі паўстае ва ўсёй яснасьці значэньне ортопэдыі, як самастойнай навукі і прадмету, з якім студэнты павінны быць добра знаёмы. Яна адчыняе перад імі бясспрэчнае вялізнае значэньне, якое мае ортопэдычнае лячэньне на права самастойнага існаваньня і знаёміць іх, такім чынам, з асновамі соцыяльнае гігіены і соцыяльнае біолёгіі.

Пратэзаваньню вызначана ў ортопэдыі далёка не апошняе месца. Яно заканчвае ўвесь цыкль ортопэдычнага лячэньня, а ў сэнсе абслугоўваньня інвалідаў вайны, яно іграе вялізную ролю, зварачаючы ім працаздольнасьць.

Нажаль, гэта галіна ортопэдыі ніколі не выкладалася на мэдычных факультэтах і гэта акалічнасьць значна дапамагла павялічэньню колькасьці калек пасьля пражытых войн.

Цяпер гэтыя памылкі выпраўляюцца.

Нар. Кам. Ах. Зд. Бел., па майму дакладу, злучыў у адно пратэзную майстэрню з адчыненай ортопэдычнай амбуляторыяй, стварыўшы, такім чынам, адну ўстанову, якая яднае ўсе галіны ортопэдыі: хірургічную, мэдыка-мэханічную і тэхнічна-пратэзную.

Гэтым ухіляюцца ўсе моманты аднабочнасьці, якія вельмі шкодны і хвораму і доктару, і ствараецца ўстанова, у якой падрастаючае пакаленьне дактароў можа атрымаць знаёмства са ўсёй ортопэдыяй.

І з таго часу, як Бел. Дзярж. Ун-т уключыў гэтую лячэбную ўстанову ў сетку сваіх устаноў, яна з лячэбнай зрабілася і навучальнай, і ў цесным кантакце з вышэйпаданымі старэйшымі дысцыплінамі дасьць магчымасьць вылячыцца вялікай колькасьці ортопэдычных хворых і таксама будзе рассаднікам ведаў для тых маладых дактароў нашае краіны, якія выходзяць на самастойны шлях працы.

Тэрмін „Ортопэдыя“ для самастойнай дысцыпліны ў вялікай галіне мэдыцыны ўведзен францускім аўтарам—праф. Nicola Andry, які апублікаваў у 1741 годзе свой двух-томны труд: „L'orthopädie, ou l'art de prévenir et de corriger dans les enfauts les deformités du corps“. Праўда, зьмест гэтае кнігі мала падобен да таго, што мы разумеем пад паняцьцем „ортопэдыя“ цяпер, праз 200 гадоў, але намёкі і паказаньні на функцыянальную тэрапію дэфармацыяў маюць сваю вартасьць, асабліва цяпер, калі ўся ортопэдыя перайшла на функцыянальныя рэйкі.

Але па сутнасьці карэньні ортопэдыі паглыбляюцца да пачатковай эры мэдыцыны, а таксама і наогул чалавецтва. І нават зусім нядаўныя прапановы, як гімнастыка, спорт і фізкультура, яскрава выступаюць у быце першабытных людзей, якія стаяць яшчэ на вельмі нізкай ступені культуры. У гэтых прыёмах можна ўгледзіць бесьсьвядомую традыцыю да прафіляктыкі розных дэфармацыяў, і вывучаючы быт і звычаі прымітыўных народаў, знаходзіш у іх карэньні гэтага руху.

Масаж таксама адносіцца да старажытных часоў. Паказаньні на гэты від лячэньня мы знаходзім у Аюр-Вэда Сузруты каля 8-мі вякоў да Н. Х.

Непарушныя павязкі і пакроўныя перавязкі былі добра вядомы дагістарычным народам. Пры раскопках пірамід знойдзены муміі з добра выпрацаванымі непарушнымі павязкамі.

Бацькай ортопэдыі, як і агульнай мэдыцыны, зьяўляецца напэўна Гіппакрат, сын лекара Гэракліда, які жыў у пятым веке да Н. Х., гэты ўсеахоплівоючы гэні старажытнага міра.

Гіппакрат ведаў этапную рэдрэссацыю касалапасьці, лячэньне зьвіхаў і пераломаў, рэдрэссацыю сколіатычнага і спондылітычнага гарба. Ён дасканала ведаў і опэрацыйную тэхніку. Вядома, што Гіппакрат карыстаўся шрубай для выпраўленьня контрактур і рабіў выпальваньне хворых месц распаленым зялезам—старажытныя, але і сучасныя прыёмы. Прыпяканьне ён уважаў за лепшае, чым нож, бо ня ўмеў спыняць цечу крыві. Ён быў знаём з прыраджонымі зьвіхамі лагво-бядровае суставы, і дапаўняў свае лячэбныя сродкі тымі працэдураму, якія носяць сёньня назву фізыятэрапіі, гэта значыць: сьвежае паветра, сонца, масаж і гімнастыка. Ваннам ён не прыдаваў асобнага значэньня.

Пасьля Гіппакрата ортопэдыя нібы та трапіць у паласу заняпаду, аж да Галена (131-206 г.), які апавясьціў свае дасьледваньне „Аб нагнаеньні ў другой шыйнай хрыбетцы“ і які прапанаваў лячыць сколіозы дыхальнай гімнастыкай і сьпяваньнем, а таксама і бандажамі. Тэрміны кіфоз, лордоз і сколіоз уведзены ў ортопэдыю Галенам. У III-м веку дактары ўжо аўладаюць тэхнікай прыпынку крыві. Antyllus уводзіць перарэзку сухажыльляў пры контрактурах. Але слабыя веды анатоміі не даюць магчымасьці разьвіць гэтую ідэю і ў хуткім часе Antyllus сам адмаўляецца ад гэтага, бо перарэзаліся больш нэрвы, чым сухажыльлі.

У Цэзара і Тацыта мы сустракаем паказаньні на ампутацыі і на штучныя канцавіны.

Па вялікім пэрыядам зацішша, ортопэдыя зноў пачынае разьвівацца ва Францыі ў XVI веку.

Ambroise Paré піша аб прыраджоных дэфармацыях, аб выкрыўленьнях хрыбетніцы і цікавіцца праблемамі пратэзаваньня. Сьледам за ім Fabricius ab Aquapendente прапануе зялезны карсэт для лячэньня, чым закладваецца фундамэнт пратэзна-бандажнай тэхніцы.

У сярэдзіне XVII стагодзьдзя зноў выступае на сцэну опэрацыйны кірунак. Minnius уводзіць перарэзку musc. sternocleidomastoidei пры крывышые. Каля таго самага часу зьяўляецца клясычны трактат Гліссона аб рахіце з дэтальна распрацованымі паказаньнямі лячэньня гэтых выкрыўленьняў гімнастыкай, масажам і апаратамі. Ён першы паказвае на паважнасьць патолёга-анатомічных дасьледваньняў для глыбейшага вывучэньня ортопэдычных пакут. Пятля Гліссона добра ўсім вядома і без яе нельга сабе мысьліць няводнай ортопэдычнай установы. На патолёга-анатомічным грунце выходзіць у сьвет шэраг прац, якія ляглі ў аснову ортопэдычнай навукі. Pott выпускае сваю працу аб спэцыфічных кіфозах у 1780 годзе. У 1803 годзе Scarpa піша аб нармальнай і патолягічнай анатоміі касалапасьці; у 1826 годзе зьяўляецца клясычная праца Dypuitren'а аб прыраджоных зьвіхах лагво-бядровае суставы.

Да гэтага-ж часу адносіцца і адчыненьне спэцыяльных ортопэдычных лячэбніц, першая такая ўстанова зьяўляецца ў Швэйцарыі па ідэі Вэнэля ў 1780 годзе. Асабліва ўславілася лячэбніца ў Канштаце пад кіраўніцвам Гэйне, першага дасьледніка поліоміэліта (1829 г.). У першай палове XIX сталецьця такія ўстановы ўзьнікаюць усюды пад кіраўніцтвам лепшых ортопэдаў: Праваца і Гуэрэна ў Парыжу, Манзы—у Копенгагене, Гірша—у Празе, Дэльпэша—у Манпельле, Дэ-Роона—у Пэтэрсбургу.

Дэльпэш зноў прапануе адчыненую перарэзку сухажыльляў, але з поваду інфэкцыі гэта карысная опэрацыя зноў паддаецца забыцьцю, пакуль Стромэйэр у 1831 годзе біскучай ідэяй падскурнай перарэзкі сухажыльля ня выправіў касадапасьці славутаму ўпасьледку ангельскаму ортопэду Littl'ю. З гэтага моманту гэта карысная опэрацыя, заснованая на зьнішчэньні супраціўленьня цягліц пры контрактурах робіцца маёмасьцю чалавецтва Стромэйэр зьяўляецца сапраўдным тварцом ортопэдыі.

Да гэтага самага пэрыяду адносяцца і спробы перамагчы і супраціўленьне касьцей пры выпраўленьні дэфармацыяў. Oesterlen увёў у 1827 г. зноў пры кепска зросшыхся пераломах касьцей остэоклязыю, забытую ў сярэднія вякі. Амэрыканец Barton зрабіў ў 1820 г. першую остэотомію пры анкілозе, а ў 1835 г. Louvier зрабіў першае brisement forcé.

Але шырокае распаўсюджаньне гэтыя карысныя опэрацыі атрымалі ледзь пасьля таго, як пачалі ўжываць этэр і хлёраформ для наркозу (1845-47 г.), і калі вынаходка Пастэра і незразумелага сваімі сучаснікамі Semmelweiss'а адчынілі шлях антысэптычнаму лячэньню ран Lister'а (1867). З гэтага моманту зрабілася магчымым прадаўжаць і пашыраць гордую пабудову хірургіі, а разам з ёй і ортопэдычнай хірургіі. Большасьць хірургаў распрацоўваюць выключна ортопэдычныя тэмы: Volkmann зноў зварачаецца да адкрытай tenotomi'i, Ollier і Langenbeck уводзяць рэзэкцыі суставаў, касьцей, адкрытыя остэотоміі, König рэзэцыруе туберкулезныя суставы. Mac-Ewen ужывае остэотомію пры X-нагах і 0-нагах (genu et crura vaega et vard); Шэдэ пры гэтакіх хваробах робіць клінавідныя высячэньні, Альбэрт прапануе артродэзы пры балбатаючыхся суставах, Нікольядоні адчыняе эру перасадак сухажыльляў. Падобнага росквіту хірургічная ортопэдыя да гэтага часу не перажывала.

Аднак, воддальныя вынікі ўсіх гэтых гэніяльных прапаноў не апраўдалі ўскладаных на іх надзей. Зьявілася, што ортопэдычныя дэфармацыі маюць вялікі нахіл да рэцыдываў і што для станоўчых вынікаў ад хірургічных опэрацыяў неабходна да апошніх дадаваць старannае мэхана-тэрапэўтычнае лячэньне і атрыманыя вынікі на працягу доўгага часу замацоўваць фіксацыйнымі апаратамі і пратэзамі.

Пачатак гімнастыкі, якая зьявілася рэстаўрацыяй практыкаваньняў цела ў старажытным сьвеце, адносіцца да 1813 году, калі швэд Лінг скарыстаўся ею дзеля лячэньня ортопэдычных выкрыўленьняў хрыбту. Потым Боннэ напісаў свой твор аб мэханічнай тэрапіі захварэньняў суставаў, а Пірагоў апублікаваў свае каштоўныя гістолёгічныя дасьледваньні аб тэнатаміі Ахіллава сухажыльля.

У 1852 годзе Mathysen увёў гіпсавую тэхніку ў ортопэдычную зброёўню і ўсьлед за гэтым зьявіліся з Амэрыкі першыя апараты для разгрузкі.

Metzger распрацаваў тэхніку массажа. Да гэтых-жа часоў адносіцца прапанова гэніяльнага Гэссінга, ня доктара, а стальяра, выраблядь фіксацыйныя апараты па дакладным гіпсавым сьлепкам, зьнятым з хворага, дакладна прыганяць іх да хворых канцавін ледзь пасьля выпраўленьняў дэфармацыяў і стальныя шыны змацоўваць не паасобнымі пражкамі і пасамі, а суцельнымі тутарамі скуранымі, альбо з цэлоідзіна, якія-б раўнамерна абхоплівалі канцавіну, разьмяркоўваючы, такім чынам, правільна нагрузку.

Як відаць з вышэйпаданага, абодва кірункі ў ортопэдыі: опэрацыйны і мэхана-пратэзны, ішлі сваімі паасобнымі шляхамі, займаючы дзьве паасобныя групы людзей, і ад гэтага значна цярпела праца

далейшае пабудовы будынка ортопэдыі, які ўжо да гэтага часу разьвярнуўся да вялікіх разьмераў. Для поўнага і праўдзівага росквіту павінны былі зьявіцца хірургі, якія-бы цалком аддаліся ортопэдыі і зварачалі-б аднгчасова ўвагу ня толькі цікавым опэрацыям, але ўзялі-б на сабе больш марудны клопат аб пратэзах, апаратах і нагляданьні за массажам, гімнастыкай, і мэханатэрапіяй.

І гэткія людзі зьявіліся.

Пачынаючы з 90-х гадоў мінулага сталецьця цэлы шэраг хірургаў прысьвячае сябе выключна ортопэдыі і адначасна клапаціцца аб разьвіцьці і ўдасканаленьні ўсіх яе галін. Тэйлор і Брэдфорд у Амэрыцы, Панцэры і Кодзівілла ў Італіі, Робэрт Джонс—у Англіі, Кірміссон і Рэдар—у Францыі,—першыя праўдзівыя ортопэды. Асаблівага расквіта ортопэдыя дабілася ў Гэрманіі—цэлы шэраг бліскучых іменьняў зьвязан з кожнай новай заваёвай ортопэдыі. Бізальскі, Лянгэ, Вульпіус распрацавалі праблему перасадкі сухажыльляў, Фэрстэр, Зеліг і Штоффэль—опэрацыі на нэрвах, Вульштэйн—перасадку цяглiц.

У бяскроўнай ортопэдыі стварыў сабе незабытнае імя Адольф Лёрэнц. Яго бяскроўныя мэтады выпраўленьня конскае ступы, пласкаступ'я, прыраджоных зьвіхаў лагво-бядровае суставы, стварэньне гіпсавага ложку і гіпсавых павязак дзеля ходу—усе гэтыя вялікія дзеяньні далі яму, і зусім заслужана, імя творца сучаснае ортопэдыі. Гоффа напісаў першы падручнік ортопэдыі. Асаблівая заслуга яго—што ён аднакава намаўляў сваім вучням любоў як да рэканструктыўных опэрацыяў, таксама і да масажу, гімнастыкі і протэзнай тэхніцы. Нельга было зрабіцца яго асыстэнтам таму, хто не працаваў на працягу двух год за варштатам і клешчамі ў яго ортопэдычна-пратэзнай майстэрні.

Я павінен таксама спыніцца і на піанэрах па культаваньню ортопэдыі ў розных канцох нашага саюзу, пераконаных работнікаў вызначанага кірунку. Я прывяду іменьні Вэгнэра, Фінка, Трыгубава ў Харкаве, Кефэра ў Адэсе і іншых. З асаблівай выразнасьцю ўстае перада мной аблічча ленінградзкіх ортопэдаў—масьцітага Турнэра і ня менш талентнага Врэдэна.

Адзначыўшы ўсе этапы разьвіцьця ортопэдыі,я яшчэ раз падкрэсьліваю яе сувязь з нэўрапаталёгіяй і нэрвнай хірургіяй, з дзіцячымі хваробамі і агульнай хірургіяй. Контакт і ўзаемадапамога спэцыялістаў у гэтых галінах хавае ў сабе яшчэ шмат усялякіх вынаходак.

Цяпер я дазволю сабе перайсьці да асноўнай тэмы, да прыраджоных зьвіхаў лагво-бядровае суставы.

Гэту тэму я выбраў, выходзячы з двух меркаваньняў: 1) ортопэдычная думка скончыла на працягу апошняга дзесяцігодзьдзя будынак тэрапіі гэтае дэфармацыі і 2) рэдка якая хвароба знаходзіцца ў гэтакай супярэчнасьці, падобна гэтай дэфармацыі—пры дасканала выпрацаванай тэрапіі, мы зусім не знаёмы з сапраўдным этыолёгічным момантам гэтае хваробы.

Высьветліць абодвы гэтыя пытаньні—ёсьць мэта маёй лекцыі,

Ужо вядомая Гіппакрату і апісаная ім, хвароба гэта па сутнасьці сваёй заставалася вякамі неразгаданай. Некаторую яснасьць, галоўным чынам, з клінічнага боку (сымптомы) унес Парэ ў XVII сталецьці. Гумбэр спрабаваў направіць такі зьвіх у 30-х гадох мінулага сталецьця, але без працяглага эфэкту. 80-тыя і 90-ыя гады зьяўляюцца пераходнай эрай для гэтай хваробы.

Спачатку спроба опэрацыйнае направы (Поггі), потым паглыбленьне тэхнікі крывавае направы (Гоффа, Лёрэнц) і нарэшце, бяскроў-

ная направа (Паці, Правац і Лёрэнц)—вось этапы разьвіцьця навукі аб направе гэтых зьвіхаў.

Зусім ня поплеч з тэраціяй пасоўвалася вывучэньне этыолёгіі гэтай хваробы, ня гледзячы на цэлы шэраг спэцыфічных асаблівасьцяй, уласьцівых гэтай хваробе.

Больш частае паражэньне левага боку, больш частая наяўнасьць яе ў дзяўчынак, чым у хлопчыкаў, спадчынная перадача—усё гэта—характэрныя асаблівасьці гэтае хваробы.

Няправільны погляд, што прырадж. зьвіхі лагво-бядровае суставы зьяўляюцца найбольш частымі ортопэдычнымі дэфармацыямі. Некаторыя аўтары сьцьвярджаюць, што прыраджоныя зьвіхі лагво-бядровае суставы сустракаюцца часьцей, чым касалапасьць. Лёрэнц лічыць, што адносіны гэтыя выяўляюцца, як 4 : 1. Гэтая думка грунтуецца на няправільным падліку лічбаў. Тады, як касалапасьць у большай колькасьці выпадкаў напраўляецца ва ўсіх хірургічных аддзяленьнях, зьвіхі лагво-бядровых суставаў застаюцца цалком у руках ортопэдаў. Таму цыфра суадносін гэтых дзьвюх найчасьцейшых дэфармацыяў выяўляецца толькі пры складаньні вялікіх зборных статыстык. Па Гаглунду, яны адносяцца адна да другой, як 9 : 10. Двубочныя зьвіхі складаюць трэцьцю частку ўсіх выпадкаў, левыя ў два разы часьцей, чым правыя.

Няма другой такой прыраджонай дэфармацыі, у адносінах якой была-бы такая рознастайнасьць думак і самых працілеглых тэорый пахаджэньня і патагэнэзу, як прыроджаныя зьвіхі лагво-бядровае суставы.

Аднак, тры становішчы зьяўляюцца кіруючымі ва ўсіх гіпотэзах і тэорыях:

1) Прыраджоныя зьвіхі—часта спадчынныя і сустракаюцца разам з другімі прыраджонымі дэфармацыямі.

2) Яны ў жанчын у 7 разоў часьцей, чым у мужчын.

3) Яны ў жанчын тых рас, якія антраполёгічна стаяць вышэй, сустракаюцца куды часьцей, чым у тых, што стаяць ніжэй. У чорных жанчын гэтыя зьвіхі надзвычайна рэдкі, а ў жоўтых—у 20 разоў радзей, чым у белых.

З шматлікіх тэорый, якія спрабавалі выкрыць сапраўдную этыолёгію гэтай дэфармацыі, ніводная не дасягае мэты.

Траўмы ў пэрыод цяжарнасьці, альбо ў часе родаў (Гиппократ, Парэ, Пэтыт), патолёгічныя зьвіхі з прычын ўнутры-ўтробных хвароб (Сэдылло, Брока, Вэрнэй), асаблівае становішча ніжніх канцавін у зародка (Дзюпіітрэн, Розэр)—усе гэтыя тэорыі можна дапасаваць да паасобных выпадкаў, але падставай для агульнага тлумачэньня гэтых хвароб яны служыць ня могуць.

Таксама ня вытрымліваюць крытыкі тлумачэньні гэтых зьвіхаў цяглічнай рэтракцыяй цэнтральнага пахаджэньня (Гуэрэн). Такая цяглічная рэтракцыя існуе, але, як мы ўбачым далей, яна зьяўляецца ня прычынай, а вынікам зьвіху.

Дзьве тэорыі заслугоўваюць таго, каб на іх спыніцца больш падрабязна.

Фон-Аммон разглядае прыраджоныя зьвіхі лагво-бядровае суставы, як вынік з затрыманьня ў разьвіцьці частак, з якіх складаецца сустава.

Кубак (acetabulum) не разьвіваецца да патрэбных яму глыбокіх разьмераў, якія могуць утрымаць галоўку, а затрымліваецца на больш нізкай ступені, калі ён яшчэ вельмі плоскі; галоўка ж бядрыцы разьвіваецца да такіх разьмераў, якія не даюць ёй зьмясьціцца ў кубку.

Гэта тэорыя, якая разглядае зьвіхі як vitium primae formationis, знаходзіць сабе апраўданьне ў многіх зьявах, якія мы сустракаем пры

зьвіхах. Частае існаваньне двубокіх зьвіхаў, адначаснае існаваньне іншых зьвіхаў або калецтваў пры зьвіхах лагво-бядровае суставы, зьяўляецца клінічнай дапамогай тэорыі фон-Аммона.

Урэшце, праменьні Рэнтгена таксама значна дапамагалі высьвятленьню пытаньняў этыолёгіі, пацьвярджаючы многае ў вышэйпаданай тэорыі. Так высьвятлілася, напрыклад, што вялікая колькасьць аднабокіх зьвіхаў сустракаюцца разам са зьменамі і на другой, здаровай суставе. Гэтыя зьмены часамі датычацца да галоўкі бядра, але найчасьцей зьмянёнымі бываюць як берагі, так і дно кубка. У той час, як дно плоскае, верхні бераг яго замест таго, каб рэзка выяўленай паземнай лініяй, як брылікам, абняць галоўку, падымаецца коса ўверх, пазбаўляючы галоўку яе фізыолёгічнае падпоры.

Частая спадчыннасьць гэтых зьвіхаў таксама тлумачыцца тэорыяй фон-Аммона.

Другую, цікавую тэорыю пабудаваў Le Damany. Для тлумачэньня зьвіхаў у лагво бядровай суставе, ён карыстаецца філёгенэтычнымі данымі; эмбрыолёгічныя дэталі гэтага пытаньня ён разглядае ў біолёгічнай пэрспэктыве.

Лагво-бядровая сустава збудована для чатырохногіх. Узаемаадносіны паміж кубкам, галоўкай і шыйкай бядрыцы такія, што імі найменш карыстаюцца чатырохногія. Чалавек-жа, які прыняў вертыкальнае становішча, не дастасаваў яшчэ сваю лагво-бядровую суставу да гэтага новага становішча. Кубак знаходзіцца занадта кпераду. Наймацнейшы край яго—задні, які ў чатырохногіх зьяўляецца верхнім. Ня ўся галоўка ахапляецца кубкам, які да таго-ж нахілен кпераду. Апошняя акалічнасьць выклікае і ў бядрыцы навароджанага рэзка выяўленую antetorsio галоўкі і шыйкі бядрыцы. Да гэтых зьмен далучаецца яшчэ і шырокае лагво белай жанчыны, якое павінна дастасавацца да галавы навароджанага. „Высокая культура белай расы вымагае большых мазгоў, мазгі—большага чэрапу, а апошні—больш шырокага лагва“ (Le Damany).

Ужо ў навароджанага жаночае лагво шырэй, чым у мужчыны. Устаноўка плоду ў чэраве маці пры вузкасьці поласьці маткі, а таксама існаваньне вышэйпаданых асаблівасьцяй расы можа служыць повадам да зьвіху, ва ўсякім выпадку, да пэўнага нахілу. Даных для гэтага досыць.

Вядомыя довады тэорыі мы знаходзім у параўнальна-анатамічных прыкладах. Ні ў воднага чатырохногага, ні ў воднай птушкі, якая ходзіць, як вядома, пры сагнутых лагво-бядровых суставах, мы ня ведаем зьвіхаў у гэтых суставах. Зародак-жа чалавека ляжыць у становішчы, пры якім яго бёдры прыцягнуты да лагва куды больш, чым у жывёлы. Шыйка-жа бядрыцы, як я вышэй паказваў, куды больш нахілена кпераду, чым у жывёлы. А чым больш гэты нахіл кпераду тым шырэй робіцца прамежак паміж пярэдняй паверхняй галоўкі і кубкам пры выпрастанай суставе і тым больш ствараецца магчымасьцяй для зьвіху. Такім чынам, пераход з эмбрыянальнага становішча ў становішча вертыкальнай паходкі пры цэлым шэрагу іншых момантаў (vitium primae formationis) таксама хавае ў сабе небясьпеку набыцьця зьвіху.

5. Асабліва зьвярнуць увагу на дакладны вучот рэакцыі пасьля прышчэпак, прычым неабходна адзначыць мясцовую рэакцыю, а таксама на агульную рэакцыю: падвышэньне тэмпэратуры, высыпку, ваніты, ангіну і пр.

6. У выпадках рэзкіх агульных і мясцовых зьявішч пасьля першай альбо другой прышчэпкі, у залежнасьці ад ступені рэакцыі, належыць альбо зусім не праводзіць наступную прышчэпку, альбо паўтарыць папярэднюю дозу.

7. Усе прышчэпленыя павінны заносіцца на адпаведныя рэгістрацыйныя лісты, якія к канцу года разам з распрацаванымі вынікамі накіроўваюцца ў Беларускі Дзяржаўны Мікрабіолёгічны Інстытут.

8. Лічыць пажаданым, каб у кожным акруговым альбо раённым пункце, дзе вытвараецца вакцынацыя, у аднэй дзіцячай установе дзеці не падлягалі прышчэпцы. Апошняя зьявілася-б кантролем для сапраўднасьці правадзімай вакцынацыі.

9. Прышчэпавы матар'ял вырабляецца Дзяржаўным Мікрабіолёгічным Інстытутам, прычым акругі загадзя прысылаюць у Дзярж. Мікрабіолёгічны Інстытут плян прышчэпачнай кампаніі, у залежнасьці ад якога Інстытутам будзе нарыхтована неабходная колькасьць вакцыны.

23 мая 1928 г. № 52

Усім акруговым Інспэктурам Аховы Здароўя, адбіткі: акруговым страхкасам, Інспэктарам Сацыяльнай Забясьпекі

Згодна пастановы Нар. Кам. Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі, Цэнтр. Бюро Урач. Экспэртызы па разгляду абскарджаных пастаноў ліквідуецца і разгляд апошніх вытвараецца на мясцох пры іншым складзе экспэртаў.

На падставе гэтага Нар. Кам. Аховы Здароўя прапануе:

1. Спыніць накіраваньне спраў на разгляд абскарджаных пастаноў у Цэнтр. Бюро Урач. Эксп. з моманту атрыманьня гэтага абежніку.

2. Абскарджаныя пастановы разглядаць на месцы ў акруговым Бюро Урач. Эксп. пры другім складзе экспэртаў альбо прыцягваючы іншых спэцыялістых.

3. Да выданьня новага палажэньня аб працоўнай экспэртызе кіравацца існуючым палажэньнем аб Бюро Урачэбнае Экспэртызы.

4. Цэнтр. Бюро Урач. Экспэрт. разглядзець у бліжэйшы двухтыднёвы тэрмін усе маючыяся справы, спыніў прыём новых спраў.

5. Акруговым Інспэктурам Аховы Здароўя пры пабудове каштарысу на 1928-29г. прадугледзіць выдаткі як на ўтрыманьне Бюро Экспэртызы (старшыня, 2 урача, 1 сакратар), так і на аплату спэцыялістых для разгляду абскарджаных пастаноў.

Нам. Нар. Кам. Аховы
Здароўя **Ліўшыц**

Інспэктар Лек. Проф. часткі
Шапавалаў

Разаслана НКАЗ

Зацьвярджаю.
Нам. Нар. Камісара Аховы
Здароўя Ліўшыц

Інструкцыя дзеля эпідэміолёгічнага дасьледваньня брушнога тыфусу альбо падазроных на яго захворваньняў

Задачай эпідэміолёгічнага дасьледваньня зьяўляюцца: 1) высьвятленьне прыроды эпідэміі, 2) вызначэньне крыніцы данай эпідэміі.

З гэтай мэтай належыць у кожнага хворага альбо ў трупаў людзей, загінуўшых ад інфэкцыі, выдзяліць у чыстай культуры мікроба, узбудзіцеля захворваньня. На першым тыдню (а таксама ў працягу ўсяго захворваньня) належыць дасьледваць кроў пасевам у жоўць, на другім тыдню паставіць рэакцыю Відаля і вытварыць бактэрыолёгічнае дасьледваньне выпаражненьняў, на трэцім тыдню дасьледаваць выпаражненьні і мачу.

З тае прычыны, што эпідэміі брюшнога тыфусу і паратыфу часта працякаюць адначасова, і высьвятленьне зьмешаных інфэкцый прадстаўляе вялікую цікавасьць і значэньне, павінна вытварыць дасьледваньня магчыма большага ліку асоб.

Пры вызначэньні крыніцы інфэкцыі належыць магчыма раней вытварыць дасьледваньне на месцы захвораньняў, дасьледаваць асяродзішча, якое атачае хворых, і ўстанавіць характар эпідэміі:

1) Ці не зьяўляецца крыніцай эпідэміі адзін тыфозны хворы (сямейныя эпідэміі, дамовыя эпідэміі).

2) Ці не распаўсюджваецца эпідэмія ад мясцовых ачагоў (эпідэмічны тыфус, тыфозныя дамы).

3) Ці не зьяўляецца крыніцай занесеныя звонку выпадкі тыфозных захворваньняў.

4) Ці няма вадзяной перадачы.

5) Ці няма перадачы інфэкцый праз малако.

6) Ці няма перадачы праз іншыя харчавыя прадукты.

Пагэтаму павінны быць дасьледваны крыніцы вады на месцы захварваньняў, месца продажу малака і харчовых прадуктаў, сваякі, сябры сям'і і суседзі хворых, высьвятлены месца знахаджэньня і працы хворых

у пэрыяд да захварэньня і ў час інкубацыйнага пэрыяду; урэшце, павінны быць дасьледваны прыехаўшыя з паражоных тыфусам мясцовасьцяй жыхары.

Калі ў дасьледванай мясцовасьці будзе ўстаноўлены брушны тыфус у хворага альбо выяўлены бацыланасіцелі, тады належыць скласьці плян данага селішча і нанесьці на яго ўсе паражоныя дамы. Пры ўстанаўленьні кантактнага характара эпідэміі, належыць скласьці схэму перадачы інфэкцыйі ад аднаго хворага да другога, з аднаго дому ў другі ў хронолёгічным парадку. Жадана таксама дадаць схэматычную географічную карту раёну.

Увесь сабраны матар'ял адсылаецца Акруговаму санітарнаму урачу, дзе і падлягае распрацоўцы.

Ніжэй прыкладаюцца прыкладныя анкеты для дасьледваньня хворых бацыланасіцеляў і вадзяных крыніц.

1. Анкета для дасьледваньня тыфозных альбо падазроных па тыфусу хворых.

1. Імя і прозьвішча.
2. Узрост і пол.
3. Адрас.
4. Прафэсыя.
5. Каму належыць домаўладаньне?
6. Пачатак хваробы: чысло, месяц.
7. Хто лячыў хворага і з якога часу?
8. Калі паступілі да раённага ўрача зьвесткі аб хваробе?
9. Плынь хваробы да дасьледваньня (лёгкае, сярэдняй цяжкасьці, цяжкае).
10. Ці ўстаноўлен дыагназ клінічна альбо бактэрыолёгічна?
11. Ці магчыма высьвятліць пахаджэньне інфэкцыйі:
    а) Якія стасункі хворага да вядомых ужо тыфозных хворых, падазроных па тыфусу альбо бацыланасіцелям?
    б) Якая (меркавальна) перадача інфэкцыйі (кантакт, малако і іншыя харчовыя прадукты, бялізна і г. д.)?
    в) Ці магчыма ўстанавіць, што хворы ў працягу апошніх чатырох тыдняў да яго захворваньня прыходзіў у датыкальнасьць з асобамі, хварэўшымі раней тыфусам.
    г) Ці не мяркуецца занос іншай інфэкцыі (адкуль? крыніца інфэкцыі)?
12. Вынікі бактэрыолёгічнага дасьледваньня: а) крыві, б) выпражненьняў; г) мачы; д) рэакцыі Відаля.

II. Анкета для дасьледваньня бацыланасіцеля.

1. Імя і прозьвішча.
2. Пол.
3. Узрост.
4. Адрас.
5. Ці хварэў брушным тыфусам і калі?
6. Ці хварэў жоўчна-каменымі хваробамі?
7. Вынікі рэакцыі Відаля.
8. Вынікі дасьледваньня кала.
9. Вынікі дасьледваньня мачы.

III. Анкета для дасьледваньня вадзяных крыніц.

1. Род крыніцы вадазабясьпекі (рака, студня, ключ, вадазбор).
2. Якая студня (шахтная, абісынская, артэзіанская).
3. Глыбіня.
4. Матар'ял сьценак.
5. Блізасьць загразьненьня крыніц (нужнікі, выграбныя ямы і г. д.)
6. Колькі двароў абслугоўвае і ці маецца грамадзкая бадзья?
7. Ці былі захворваньні сярод асоб, якія карыстаюцца вадой з студні? (колькі? у колькіх дамох?)
8. Вынікі дасьледваньня вады.

Зацьвярджаю:
Нар Кам. Аховы Здароўя
М. Барсукоў.
13 чэрвеня 1928 г.

Палажэньне аб анцірабічных пунктах БССР.

1) У мэтах правядзеньня аднэй з мер барацьбы з шалёнствам (прыбліжэньне пастэраўскіх прышчэпак к насельніцтву) на тэрыторыі Беларусі функцыяніруе шэраг анцірабічных пунктаў, існуючых як філіялы Беларускага Дзяржаўнага Мікра-біолёгічнага Інстытуту.

Парадак адчыненьня пунктаў.

2) Пункты адчыняюцца з дазволу Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя Дзяржаўным Мікра-біолёгічным Інстытутам, які праводзіць таксама ўсю арганізацыйную работу і работу па інструкціраваньню і падрыхтоўцы ўрачоў, ведаючых гэтымі пунктамі. Падрыхтоўка работнікаў праводзіцца альбо шляхам каротка - тэрміновага прабываньня апошніх у Дзярж. Мікраб. Інстытуце, альбо шляхам выезду супрацоўнікаў Інстытуту на месца адчыненьня пункту.

Месца знахаджэньня пунктаў.

3) Пункты адчыняюцца ў акруговых гарадох пры лябораторыях, а ў раёнах, дзе лябораторыі няма,—пры райбольніцах.

Асноўныя задачы пунктаў.

4) У задачы анцірабічных пунктаў уваходзіць: а) вытворчасьць прышчэпак усім патрабуючым іх; б) па магчымасьці, лябараторная дыягносьціка мазгоў жывёлы, падазроных на шалёнства; в) кансультацыя з мясцовымі органамі аховы здароўя па пытаньнях профіляктыкі шаленства; г) вядзеньне санітарна-асьветнай працы па пытаньнях барацьбы з шаленствам.

Памяшканьне і абсталяваньне.

5) У інтарэсах правільнай пастаноўкі справы, анцірабічны пункт павінен мець дзеля прышчэпак самастойнае памяшканьне. Акра-

мя прышчэпкавага пакою павінна быць абавязкова прадугледжана месца для хаваньня нармальнага запасу атрымліваемай вакцыны (пакой—леднік альбо цёмнае і прахладнае памяшканьне).

Увага: Рэгістрацыя ўкушаных і перавозка могуць адбывацца ў агульных больнічных памяшканьнях.

6) Абсталяваньне анцірабічных пунктаў ўстанаўліваецца ў залежнасьці ад выкананьня імі асноўных задач (§ 4) і колькасьці прышчэпак.

К ліку абавязковых прадметаў абсталяваньня належаць: а) шпрыцы 2 і 5-ці грам. з запасам іголак і б) стэрылізатар дзеля стэрылізацыі шпрыцаў і іглаў у кіпячонай вадзе ў час вытвараемасьці прышчэпак.

На пунктах, дзе вытвараюцца дыягнастычныя аналізы на шаленства, акрамя таго неэбходны: а) мікраскоп з імэрсіенай сыстэмай; б) мікраскоп, в) прыстасаваньне дзеля заліўкі ў парафіну гістолёгічных зрэзаў; г) тэрмастат; д) патрэбныя наборы фарбаў і е) клеткі дзеля ўтрыманьня заражонай жывёлы.

Прышчэпкавы матар'ял.

7) Анцірабічныя пункты рэгулярна пэрыядычна атрымліваюць вакцыну ад Дзяржаўнага Мікрабіолёгічнага Інстытуту, паштовымі пасылкамі па папярэднім заяўкам. У вельмі хуткіх выпадках пункты самі рэгуліруюць атрыманьне вакцыны шляхам тэрміновых запросаў ў Інстытут.

Увага 1: Ва ўхіленьне перабою ў вытворчасьці прышчэпак, пункты заўсёды абавязаны мець запас прышчэпкавага матар'ялу, хаця - бы на некалькі дзён.

II: Пры карыстаньні прышчэпкавым матар'ялам, неабходна кіравацца тэрмінам годнасьці вакцыны, паказаным на эцікетах.

8) Прышчэпкавы матар'ял атрымліваецца на пункты ў драўляных скрынках у гэрмэтычна закупораных ампулах і фляконах. У выпадку ўзьнікнавеньня сумленьня адносна стэрыльнасьці матар'ялу (невыстарчальна-гэрматычная ўпакоўка, мутны фізыолёгічны раствор і г. д.), такавы матар'ял бязумоўна у работу дапушчацца не павінен. Вакцына раскупорваецца перад самай работай. Скарыстаць у другі раз на другі дзень разьведзеную вакцыну не дазваляецца.

Загадваньне пунктам.

9. Прышчэпкі вытвараюцца спэцыяльна інструкціраваным урачом, які знаходзіцца на вучоце Дзяржаўнага Мікрабіолёгічнага Інстытуту. Аб уходзе урача з работы Інстытут павінен быць загадзя паведамлен дзеля падрыхтоўкі іншага работніка.

Вытворчасьць прышчэпак.

10. Прышчэпкі вытвараюцца строга па схеме, устаноўленай Дзяржаўным Мікробіолёгічным Інстытутам. У выпадках, патрабуючых кансультацыі, пункты тэрмінова зносяцца з Інстытутам.

Увага: Дзеля пасьпяховай і правільнай работы пункта, неабходна яго жывая пісьменная сувязь з Інстытутам, жадана час ад часу даведваньне загадчыкаў анцірабічнымі пунктамі інстытуту;

Рэгістрацыя і справаздачнасьць

11. Рэгістрацыя прышчэпліваемых на пунктах вытвараецца на спэцыяльных друкаваных рэгістрацыйных карт. ах, атрымліваемых з Інстытуту. Карткі запаўняюцца з асаблівай увагай (падрабязны анамнез, катэгорыя, дазіроўка і г. д.) і штомесячна адсылаюцца ў Інстытут, дзе матар'ял гэты статыстычні апрацоўваецца. Акрамя картак, пункты асабова паведамляюць аб маючыхся ў іх асложненьнях у час, альбо пасьля прышчэпаў і аб выпадках сьмерці ад шаленства

Увага: Паміма картак пункты абавязаны рэгістраваць прышчэпліваючыхся ў асобнай кнізе з графамі, адпаведнымі рэгістрацыйнай картцы. Кніга гэта хаваецца на пункце.

Санітарная асьвета.

11. Анцірабічныя пункты павінны вясьці. санітарна-асьветную працу па барацьбе з шаленствам як на самым пункту, так і звонку яго, шляхам устройства гутарак, лекцый і г. д.

Увага: Жадана абсталяваць чакальню пункта плякатамі і лёзунгамі па пытаньнях шаленства і барацьбы з ім.

Інструкцыя па пэрыядычным мэдыцынскім аглядам рабочых, якія працуюць у шкадлівых вытворчасьцях

1. Пэрыядычны мэдыцынскі абгляд рабочых праводзіцца ў першую чаргу ў тых шкадлівых вытворчасьцях і ў тыя тэрміны, якія пералічаны ў пастанове НК Працы і Аховы Здароўя БССР 20 сьнежня 1926 г. № 20.

2. Агляды вытвараюцца ў тых лекавых установах, да якіх прымацаваны рабочыя таго ці іншага прадпрыемства.

3. Арганізацыя мэдагляду рабочых і кіраваньне ім ускладаецца на спэцыяльнага доктара, знаёмага з гэтай справай.

Увага: У тых гарадох, дзе па мясцовым умовам немагчыма мець спэцыяльнага доктара дзеля арганізацыі і кіраваньня мэдаглядам, праца гэта ўскладаецца на аднаго з дактароў амбулаторыі, адказнага за гэтую працу.

4. Дактары, якія праводзяць мэдагляд і кіруюць гэтай справай, павінны азнаёміцца з прадпрыёмствам, умовамі працы рабочых і з адпаведнымі аддзеламі прафэсыйнай паталёгіі.

5. Доктар, на якога ўскладзены арганізацыя мэдагляду і кіраваньне ім, павінен азнаёміцца праз лекава-проф. установы з захворваньнем рабочых тых прадпрыемств, якія будуць падлягаць агляду.

6. Мэдагляд вытвараецца спэцыяльнымі дактарамі, дзе яны маюцца па каштарысу, а ў іншых мясцовасьцях—урачамі амбулаторыі, пры гэтым апошнія ўрачы ў час агляду рабочых вызваляюцца ад прыёму звычайных хворых.

7. У неабходных выпадках рабочыя, якія аглядаюцца, накіроўваюцца дзеля падрабязговага вывучэньня яго хваробы ў спэцыяльных установах (больніца, дыспансэр, рэнтген, лябораторыя і інш.) альбо да спэцыялістаў; гэта накіраваньне вытвараецца праз доктара, адказнага за правядзеньне мэдагляду.

8. Паданыя мэдагляду тым доктарам ці іншым спэцыялістам альбо спэцыяльнай установай уносяцца ў адпаведную картку рабочага.

9. Па скончэньні мэдагляду прадпрыемства доктар, які кіруе працай, вытварае статыстычную апрацоўку картак, пасьля чаго склікаецца нарада дактароў, якія праводзілі мэдагляд з удзелам Інспэктара працы і заўкома, якія на падставе апрацоўкі картак, параўнаньня з папярэднімі паданымі (гл. арт. 5) і вывучэньня санітарнага становішча прадпрыемства робіць практычныя прапановы.

10. Мерапрыемствы па палепшаньню агульных умоў працы на прадпрыемствах вытвараюцца праз Інспэктара Працы на падставе супольнага абмеркаваньня распрацованых прапаноў.

11. Індывідуальная дапамога хворым, выдзеленым пры аглядзе, аказваецца кіраўніком мэдагляду праз адпаведную ўстанову (дыспансэры, Сав. Сацыяльн. Дапам., Дамы Адпачынку і інш.).

12. Усякія далейшыя зьмены ў становішчы здароўя агледжаных рабочых шкадлівых вытворчасьцяў, павінны рэгістравацца ў картках, аб чым сочыць доктар, адказны за мэдагляд. Гэтыя паданыя ў далейшым таксама вывучаюцца і на падставе гэтага вывучаецца дынаміка захворваньняў прадпрыемства.

13. Па ўсім пытаньням, якія могуць сустракацца ў працы па мэдагляду, мейсца, павінны зьвяртацца ў клініку прафэсыянальных хвароб.

Нам. Нар. Кам. Аховы Здароўя
Ліўшыц

Інспэктар Лек. Праф. Часьці
Шапавалаў

15 чэрвеня 1928 г. № 832

Усім акруговым Інспэктурам Аховы Здароўя

З наступленьнем летняга часу неабходна ўзьмацніць санітарны нагляд за прадпрыемствамі, вытворчасьцю і гандлем харчовых прадуктаў і напіткаў і лябораторны кантроль за якасьцю іх. Разам з гэтым неабходна ўжыць усе меры да аздараўленьня харчовага рынку. У выпадку невыкананьня жыцьцёвых санітарных вымаганьняў ці парушэньня ўстаноўленых санітарных правілаў—даводзіць аб гэтым да ведама АВК, РВК і Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі, прыцягваючы праз іх вінаватых да адказнасьці. У выпадку невырашэньня пытаньня на мясцох, паведаміць НКАЗ.

Нар. Кам. Аховы Здароўя
Барсукоў

Інсп. Сан. Эпід. Часьці **Магілеўчык**

27 чэрвеня 1928 г. № 50.

Усім акруговым Інспэктурам Аховы Здароўя.

Гэтым даводзіцца да ведама, што пры Цэнтральным Камітэце Бел. Т-ва Чырвонага Крыжу заснавана—

Кніжная база сан.-асьветнай і мэдычнай літаратуры.

Усім органам Нар. Кам. Аховы Здароўя азначаная кніжная база робіць на купленую літаратуру максымальную скідку, у зьвязку з чым набыцьцё кніг праз базу Чырвонага Крыжу дасьць адпаведнай часьці бюджэту Акруговых Інспэктур безварункавую эканомію.

Прыймаючы пад увагу гэта, Нар. Кам. Аховы Здароўя прапануе ўсім Акруговым Інспэктурам, роўна як і ўсім наогул органам Наркамата на мясцох, набываць з гэтага дню сан.-асьветную і мэдычную літаратуру, плякаты, макеты, кіно-ленты і інш. выключна праз цэнтральную базу Т-ва Чырвонага Крыжу.

Адпаведныя праспэкты будуць высланы Вам у бліжэйшым часе.

Адрас базы, куды трэба накіраваць усе заказы: Менск, вуліца Карла Маркса, 3, Ц. К. Бел. Т-ва Чырвонага Крыжу.

Народны Камісар
Аховы Здароўя **Барсукоў**

Член Калегіі НК Аховы
Здароўя **Цьвікевіч**

Зацьвярджаю:
Нар. Кам. Аховы Здароўя
(Барсукоў).
3 ліпеня 19 8 г.

Палажэньне аб Беларускім Дзяржаўным Інстытуце Фізыятрыі і Артапэдыі.

I. Мэты і задачы Інстытуту.

1. Беларускі Дзяржаўны Інстытут Фізыятрыі і Артапэдыі зьяўляецца лекава-прафілактычнай і навукова-дасьледчай установай, якая ставіць сваёй мэтай:

а) вывучэньне ўплыву фізычных фактараў у тым ліку і фізвыхаваньня на арганізм чалавека;

б) лячэньне і вывучэньне нэрвовых, артапэдычных і іншых хвароб, якія патрабуюць фізычных мэтадаў лячэньня.

2. Інстытут займаецца: а) падрыхтоўкай кадру фізыатэрапэўтаў, нэўрапаталегаў, артапэдаў і ўрачоў па фізвыхаваньню, б) арганізуе спэцыяльныя курсы па перападрыхтоўцы спэцыялістых, памянёных у арт. „а", в) падрыхтоўкай кваліфікаванага мэдпэрсаналу па фізыятрыі і артапэдыі па Беларусі, д) распрацоўкай навукова-практычных пытаньняў па даручэньню НКАЗ і іншых устаноў, якія маюць дачыненьні да фізыятрыі і артапэдыі, е) распрацоўкай навуковых дасьледваньняў " галіне фізыятрыі і артапэдыі.

II. Арганізацыйная структура.

3. Інстытут складаецца з наступных частак: а) паліклінікі, б) лябараторыі, в) вада-гразе-электра—і сьвет. - лячэбніцы, г) рэнтгэна і кварца, д) масажа, е) лекавай гімнастыкі і мэханатэрапіі, ж) апэрацыйнай з гіпсавым аддзяленьнем.

4. Пры Інстытуце маецца: а) нэўра-псыхіятрычны дыспансэр, б) стацыянар па нэрвовым хваробам, в) стацыянар па артапэдычным хваробам.

5. Інстытут падпарадкаван НКАЗ і ўвязвае сваю працу з зацікаўленымі катэдрамі і іншымі ўстановамі, якія могуць мець дачыньне да працы Інстытуту.

III. Управа Інстытута.

6. На чале Інстытуту стаіць Дырэктар і яго намесьнік, якія прызначаюцца і зацьвярджаюцца НКАЗ. Навуковыя і іншыя адказныя працаўнікі Інстытуту праходзяць праз конкурсную камісію пры НКАЗ і зацьвярджаюцца НКАЗ.

7. Дырэктар адказвае за ўсю працу Інстытута і кіруе ўсімі працаўнікамі апошняга.

8 Для разгляду пляну працы і справаздач Інстытуту і іншых пытаньняў Дырэктар склікае Савет Інстытуту, у склад якога уваходзяць: Дырэктар, яго намесьнік, прадстаўнік НКАЗ, навуковыя працаўнікі Інстытуту і прадстаўнікі зацікаўленых ведамств.

9. Пры Інстытуце існуе навуковая канфэрэнцыя.

Увага: Інструкцыя аб працы Савету распрацоўваецца НКАЗ.

IV. Мэтады працы.

10. Інстытут ажыцьцяўляе свае мэты шляхам шырокага выкарыстаньня розных спосабаў фізыятэрапіі і артапэдыі.

11. Інстытут вядзе навукова-дасьледчую і экспэрымэнтальную працу па высьвятленьню ўплыву розных фактараў акружаючага асяродку на арганізм чалавека і жывёлы

12. Інстытут інструктуе акруговыя фізыятрычныя габінэты, камандыруе сваіх працаўнікоў у вакругі і раёны і з дазволу НКАЗ склікае нарады акруговых працаўнікоў у галіне фізыятрыі і артапэдыі.

13. Інстытут друкуе навуковыя артыкулы сваёй працы ў спэцыяльных зборах працы Інстытуту.

14. Інстытут вядзе навуковую і навукова-практычную працу праз прыдадзеныя яму ўстановы.

V. Сродкі Інстытуту.

15. Інстытут утрымоўваецца згодна зацьверджаных штатаў па каштарысу НКАЗ і самастойна распараджаецца сваімі крэдытамі ў мэтах зацьверджаных каштарысаў.

16. Інстытут мае свае пячатку і штамп.

9 ліпеня 1928 году № 57.

Усім акруговым Інспэктурам Аховы Здароўя.

Пры гэтым накіроўваецца інструкцыя па ажыцьцяўленьню пастановы СНК аб нормах мэдыцынскага абслугоўваньня застрахованых і іх сем'яў для кіраваньня і выкананьня.

Дадатак: Памянёнае.

Нам. Кам. Аховы Здароўя **Ліўшыц.**

Інспэктар Лек. Праф. Часьці **Шапавалаў.**

Інструкцыя Н. К. Аховы Здароўя па ажыцьцяўленьню пастановы СНК (30/V—1928 г. № 54) аб нормах мэдыцынскага абслугоўваньня застрахаваных і іх сем'яў.

1. Нормы, зацьверджаныя СНК на 1927-28 г., сярэднія па Рэспубліцы, чаму зьніжэньне іх не павінна мець месца там, дзе яны ў сучасны момант вышэй рэспубліканскіх.

2. У тых акругах, дзе нормы ніжэй зацьверджаных СНК павінны быць прыняты усе крокі, каб павялічыць іх і давесьці да рэспубліканскіх.

3. Уведзеныя нормы не павінны пагаршаць якасьць аказваемай дапамогі, у зьвязку з чым неабходна правесьці нормы прыёму ўрачоў па габінэтам і рацыяналізіраваць працу лекавых устаноў.

4. Нормы прыёму ўрачоў за гадзіну працы ўстанаўліваюцца наступныя:

		хворых	
а) тарапэўтычны габінэт		4—5	
б) хірургічны	„	10	Дапам. ся-
в) гінэколёгічны	„	5—6	рэдні мэдпэр.
г) нэрв. і псыхіатр.	„	4—5	
д) в у ш н ы	„	6—7	
е) в о ч н ы	„	6—7	
ж) скурна-вэнэр.	„	7—8	
з) пэдыятр.	„	4—5	
и) сухотны	„	3,5—4	
к) жалуд. кішэчн.	„	3,5—4	
л) зубаўрачэбны	„	3,5—4	Пры санац. 3.

5. З мэтай пашырэньня прыёму ўвадзіць прыёмы ў нядзелю і сьвяточныя дні, акрамя рэвалюцыйных сьвяточных дзён.

6. Увесьці прыёмы па тым спэцыяльнасьцям, якія зараз адсутнічаюць, альбо пашырыц тыя, у якіх больш адчуваецца патрэба (жалудачна-кішэчныя, нэрвовыя і інш.).

7. Прыстасаваць пакоі для разьдзяваньня хворых, каб ня траціць часу ў габінэце доктара на разьдзяваньне і адзяваньне.

8. Увесьці друкаваныя трафарэты тых рацэптаў, якія найбольш часта ўжываюцца ў практыцы таго альбо іншага габінэту, прытрымліваючыся каталёгу мэдыкамэнтаў, выданага НКАЗ.

9. Увесьці запіс паўторных хворых праз доктара, які сам павінен вызначаць тэрмін яўкі хворага і гадзіну яго прыёму.

10. Пры выдачы хвораму № рэгістратура павінна паказаць час прыёму яго доктарам.

11. На дзьверах габінэту павінна быць адзначана, па якім хваробам вядзецца прыём які доктар прымае і які па парадку хворы ў доктара (хворы вешае на адзначаным месце свой № пры ўваходзе ў габінэт).

12. Завесьці пры ўваходзе ў амбулаторыю дошку з паказаньнем правіл і гадзін рэгістрацыі і прыёму па габінэтам, парадку атрымоўваньня лякарства, справак, бюлецэня і інш.

13. У рэгістратуры павінен быць адзначан парадак рэгістрацыі хворых (калі пачынаецца рэгістрацыя па тым ці іншым спэцыяльнасьцям).

14. У кожны габінэт павінны быць застаўлена 2-3 номары для тэрміновых хворых, якія могуць выдавацца іншым хворым толькі ў канцы прыёму пры адсутнічаньні тэрміновых выпадкаў.

15. Каб зьнішчыць хвасты пры запісі хворых у рэгістратуры, ужываць выдачу хворым (яны самі іх бяруць) чарговых нумароў, па якім яны і выклікаюцца для рэгістрацыі.

16. Завесьці сталы вучоту адмоў у прыёму па тым ці іншым спэцыяльнасьцям.

17. Завесьці ў рэгістратуры хаваньне індывідуальных картак па вуліцах і нумарам дамоў.

Нам. Народ. Кам. Аховы Здароўя
Ліўшыц.

Інсп. Лек. Праф. Часьці
Шапавалаў.

Узгоднена:

ЦСПСБ
Галоўсацстрах
ЦП Саюзу Мэдсанпрацы

Зацьвярджаю.
Народны Камісар Аховы
Здароўя БССР Барсукоў

Пастанова Ўсебеларускай Нарады па барацьбе з трыхінелезам 9—10 красавіка 1928 году

г. Менск

П а ч а с ь ц і м э д ы ц ы н с к а й.

1. Канстатаваць,—

а) Выяўленьне трыхінелеза людзей у частцы акруг БССР;

б) Праўдападобнасьць трыхінелезам у іншых сумежных тэрыторыях;

в) Праўдападобнасьць прагляду выпадкаў трыхінелеза людзей у віду незнаёмства ўрачэй на мясцох з дыагностыкай і клінікай гэтага захворваньня.

2. Лічыць захворваньне людзей трыхінелезам у Беларусі эпідэмічным з асабістым клінічным малюнкам, які перашкаджае дыагностыцы лечашчымі ўрачамі.

Лічыць тыповым для трыхінелеза людзей востры пачатак захворваньня з высокай тэмпэратурай і ацёкам вочных век (адутлаватасьць) пры рэзкай эозінофіліі ў крыві. Адутлаватка, апісаная іншымі аўтарамі ў мясцох моцнага распаўсюджваньня трыхінелеза сьвіней, а таксама якая адзначалася і ў Беларусі шэрагам лечашчых урачоў, павінна быць прызнана ідэнтычнай з трыхінелезам.

3. Распаўсюдзіць паміж масы лечашчых урачоў веды аб трыхінелезе і аб распаўсюджваньні гэтай хваробы ў Беларусі, асьвятленьнем пытаньняў трыхінелеза на старонках журнала „Бел. Мэд. Думка“, правядзеньнем адпаведнага цыкла на курсах удасканаленьня ўрачоў і інш.

4. У практычнай працы, пры дыагностыцы трыхінелеза людзей у першую чаргу карыстацца мікра-гельмінтоскопіяй факальных мас (асабліва у выпадках першапачатковага пэрыяду захворваньня).

5. Улічваючы частату захворваньня трыхінелезам сярод насельніцтва Беларусі, зьвярнуць увагу шырокіх мас урачоў на неабходнасьць дыфэрэнцыяльнай дыагностыкі цэлага шэрагу ліхарадачных і нэрвовых захворваньняў з трыхінелезам, улічваючы як налічча кардынальных сымптомаў у тыповых выпадках, так і адсутнічаньне некаторых з іх у антытыповых.

6. Лічыць мэтазгодным правядзеньне дэратызацыі на гарбарнях, жівадзернях і інш., а таксама зьвярнуць увагу на прыбіраньне і зьнішчэньне пацуковых трупаў на рынках.

7. У стат. форме „Двухтыднёвага абгляду руху эпідэмічных захворваньняў“ увесьці графу „трыхінелез“.

8. Прасіць прадстаячую Рэспубліканскую Нараду па санітарнай асьвеце прапрацаваць пытаньне аб санітарна-асьветнай працы па трыхінелезу і іншым захворваньням, выклікаемым паразітуюшчымі чарвямі.

9. Прапрацаваць пытаньне аб узмацненьні адукацыі па мэдыцынскай гэльмінталёгіі і, у прыватнасьці, аб увядзеньні адпаведнай дысцыпліны на старэйшых курсах мэдыцынскага факультэту.

По часьці вэтэрынарнай.

10. Прыймаючы пад увагу, што згодна статыстычных даных разьніц і мясакантрольных станцый па агляду прывазных мясных продуктаў за 1926-27 г. Гомельская і Бабруйская акругі зьяўляюцца моцна паражонымі трыхінелезам сьвіней, іменна: у першым 1 трых. сьвіньня прыходзіцца на 48 здаровых, а ў другім—1 на 107:

адзначаючы тое, што % хворых сьвіней у Беларусі перавышае наглядаючаеся захворваньне трыхінелезам у іншых мясцовасьцях СССР;

лічыць неабходным аб'яўленьне паказаных акруг пагражаючым і па трыхінелезу.

11. Прызнаць неабходным прыняцьця мер к пашырэньню сеці вэтэрынарна-ўрачэбных вучасткаў, у першую чаргу ў Гомельскай і Бабруйскай, а потым і ў іншых акругах Рэспублікі і арганізацыю трыхінелескопіі на ўсіх бяз выключэньня разьніцах, на якіх вытвараецца забой сьвіней.

12. Для палепшаньня вытворчасьці трыхінелескопіі на разьніцах і мясакантрольных станцыях неабходна арганізаваць курсы па перакваліфікацыі асоб, працуючых па трыхінелескопіі і для ўноў жадаючых вывучаць трыхінелескопію; устанавіць норму працы іх і выдаць інструкцыю па вытварэньню трыхінелескопіі.

13. З мэтай бясшкоднага скарыстаньня ўмоўна-годных мясных продуктаў (у тым ліку і ўмоўна-годнага мяса, слаба-паражонага трыхінелезам), неабходна пацьвярдзіць гаспадарчым ворганам разьніц аб устанаўленьні ва ўсіх гарадзкіх разьніцах стэрылізатараў для належнага абезшкоджваньня ўмоўна-годных мясных продуктаў і прадажы гэткіх выключна з фрэй-банкаў.

14. З мэтай бязшкоднага скарыстаньня нягодных к ужываньню у харч людзям канфіскатаў разьніц, у тым ліку і моцна паражоных трыхінелезам сьвіных туш, неабходна ўстанавіць на ўсіх гарадзкіх разьніцах апараты для ўтілізацыі канфіскатаў.

15. З мэтай ухіленьня ад страт, якія наносяцца мяса-гандлюючым дзяржаўным і коопэрацыйным арганізацыям і асобным сялянам пры канфіскацыі нягодных мясных туш, у тым ліку і трыхінелезных сьвіных туш, а таксама каб ухіліцца ад непаразуменьняў, узьнікаючых паміж уласьнікамі іх і вэтпэрсаналам.

Неабходна ўзбудзіць пытаньне перад СНК аб увядзеньні абавязковага забясьпечваньня забойных жывёл, у першую чаргу сьвіней, на ўсіх разьніцах і мяса-кантрольных станцыях, якія знаходзяцца пад сталым вэтэрынарна-санітарным наглядам.

16. Прыймая пад увагу, што галоўным спосабам заражэньня сьвіней трыхінелезам зьяўляецца паяданьне імі ўсякага рода адкідаў, заражоных трыхінелезам, неабходна палепшыць умовы ўтрыманьня і кармленьня сьвіней.

17. Для ўстанаўленьня ступені заражонасьці трыхінелезам пацукоў, кошак, сабак і іншых насіцелей трыхінел, неабходна арганізаваць пры вэтэрынарна-бактэрыолёгічных установах Рэспублікі дасьледваньне паказаных жывёл на трыхінелез.

Агульныя.

18. НКЗему, НКАховы Здароўя і НК Унутр. Спраў (сумесна) перапрацаваць выданую ў 1916 г. „Инструкцыю аб вэтэрынарна-санітарным наглядзе за прывозным для продажы мясам і мяснымі продуктамі".

19. Устанавіць кантакт паміж вэтэрынарнымі і мэдыцынскімі працаўнікамі па правядзеньню мерапрыемстваў па барацьбе з трыхінелезам, наладзіць узаемную інфармацыю аб выяўленьні і руху трыхінелеза ў людзей і сьвіньней, вытварыць сумесны агляд найбольш паражоных трыхінелезам залюдненых пунктаў.

20 Лічыць неабходным НКАховы Здароўя сумесна з Наркамземам узяць на сябе ініцыятыву арганізацыі і правядзеньня ў жыцьцё экспэдыцыі з спэцыялістых-гельмінтолёгаў, якая мае сваей мэтай:

абгляд насельніцтва паражоных раёнаў БССР у сэнсе выяўленьня характара і размера трыхінелеза і іншых захворваньняў, выклікаемых паразытуючымі чарвямі;

абгляд гельмінтафауны жывёл.

Прасіць прафэсара К. І. Скрабіна садзейнічаць у справе арганізацыі гэтай экспэдыцыі па тыпу меўшых мейсца аналёгічных саюзных экспэдыцый.

У дапамогу аснаўному экспэдыцыённаму ядру гельмінтолёгаў прыбавіць:

а) Катэдры паразіталёгіі і патолёгічнай анатоміі ВУЗ'аў БССР;

б) Камісію па вывучэньню фауны БССР пры Інстытуце Беларускай Культуры;

в) Вэтэрынарнае Бюро НКЗема БССР;

г) Санітарную арганізацыю НКАховы Здароўя БССР;

д) Дорздравы МББ і Зах. чыгун.;

е) Мэд. і вэт. персанал тых раёнаў, дзе будзе ляжаць шлях сьледваньня экспэдыцыі;

ж) Краязнаўчыя арганізацыі Б. Дз. У.

21. Матар'ялы цяперашняй нарады надрукаваць і разаслаць сельскім і іншым мэдыцынскім і вэтэрынарным урачом БССР для скарыстаньня іх у штодзённай практычнай працы.

Інформацыйны кон'юнктурны лісток Белмэдгандлю аб стане аптэчнага рынку БССР

1 ліпеня 1928 г. № 3

Кон'юнктура за чэрвень

(Па аддзелу мэдыцынскага забесьпячэньня)

1. Мэдыкамэнтознае забесьпячэньне таварамі заграпічнага пахаджэньня знаходзіцца ў параўнаўча шчасным становішчы. Некаторыя нехапаючыя прадметы, як напр. Rhizoma Hydrastis Canadensis, нездавальняючая колькасьць тэрмомэтраў у бліжэйшым часе чакаецца да атрыманьня. Што датычыцца прадметаў абсталяваньня (імпортавых), то становішча ў БССР можна лічыць больш чым здавальняючым. Усе заяўкі лекавых установ на ўсялякае абсталяваньне задавальняецца амаль што поўнасьцю. З прычыны нездаволенасьці некаторых Аптэкакіраўніцтв паасобнымі выпадкамі разьмеркаваньня імпортавых мэдыкамэнтаў, Белмэдгандаль мае намер на будучы час сумесна з Народным Камісарыятам Аховы Здароўя ўстанавіць коэфіцыент сумы імпортавых тавараў для кожнай акругі. З гэтаю мэтаю ад ўсіх Аптэкакіраўніцтв запатрабаваны гадавыя заяўкі на патрэбныя ім імпортавыя мэдыкамэнты і абсталяваньні.

2. У адносінах да прадметаў унутрысаюзнага пахаджэньня (мэдыкамэнтаў і абсталяваньня) дэфэктура цяпер амаль што поўнасьцю зжыта. На Цэнтральным Складзе Белмэдгандлю заказы ў сучасны момант выконваюцца на 90—95%. Для большай плянавасьці і з мэтаю зьмяншэньня накладных выдаткаў Белмэдгандаль мяркуе перадаваць квартальныя заказы на мэдыкамэнты і абсталяваньне „Госмэдторгпрому" для беспасярэднай адпраўкі наступным акругам: Менскай, Віцебскай, Гомельскай і Аршанскай. Квартальныя-жа заяўкі астатніх акруг на працягу гэтага кварталу пакуль будуць концэнтраваны на Цэнтральным Складзе Белмэдгандлю.

3. Па Хэмсындыкату за апошні час пачалі паступаць наступныя тавары: саляная кіслата, нашатырны сьпірт, сода бікарбанат, хлёрынавая вапна, анілінавыя фарбы. Серкавая кіслата і каўстычная сода дагэтуль складаюць востры дэфэкт. Ня гледзячы на неаднакротныя абяцаньні Хэмсындыкату, што ў чэрвені серкавая кіслата будзе адпраўлена, да гэтага часу ніякіх паведамленьняў не атрымана.

4. Па Тэкстыльсындыкату. Рэгулярнае забесьпячэньне марляй за апошні час будзе крыху парушана на працягу ліпеня і жніўня, марля будзе атрымлівацца колькасьцямі няроўнай меры з прычыны адпускное кампаніі.

5. Па Гумтрэсту ніякіх зьмен ў сэнсе кон'юнктуры ў параўнаньні з мінулым не прадбачыцца. Дэфэктура на некаторыя хірургічныя і гаспадарчыя прадметы будзе пасту пова папаўняцца.

6. Па Шклотрэсту. Белмэдгандль лічыць неабходным, каб Аптэкакіраўніцтвы загадзя давалі заказы на аптэкарскае шкло дзеля таго, каб не затрымалася выкананьне заказаў з прычыны перавозкі тавараў гужам у восень па дрэнных дарогах. У бліжэйшы час Шклотрэст распачынае выраб кубкаў Эссмарха, матар'яльнага шкла і крывясмочных банак.

7. Па Донвуглю кон'юнктура з мэталічнай ртуцьцю вельмі пагоршылася. Донвугаль выдае толькі 40% колькасьці, якая заяўлена Белмэдгандлем. Каб ня было нерацыянальнага выдаткаваньня памянёнага прадмету Белмэдгандаль поўнасьцю перадае мэталічную ртуць фармазаводу для выррабу ртутнай мазі.

8. Па Цэнтропробізолю. З мэтаю зжываньня недахопу ў корках Белмэдгандаль зварочвае ўвагу ўсіх Аптэкакіраўніцтв на сваячасную перадачу заявак на коркі Цэнтропробізолю. Вельмі пажадана, каб Белмэдгандлю былі прысланы копіі гэтых заявак дзеля таго, каб высьветліць сапраўдную патрэбу БССР у корках і каб дамагчыся ў адпаведных організацый больш-менш рэгулярнага забесьпячэньня БССР Цэнтропробізолем.

9. Па Тэжэ. Непаразуменьні па разьлікам і % скідкі паміж Заходняй канторай Тэжэ і Аптэкакіраўніцтвамі, якія траплялісія раней, у сучасны момант зжыты. У далейшым Аптэкакіраўніцтвы будуць атрымоўваць той самы % скідкі і % на тарыф, які яны дагэтуль. Пры павялічэньні забору на 10% у канцы году ім будзе дадзены дадатковы бонус. Неабходна каб Аптэкакіраўніцтвы загадзя далі нам свае заяўкі з мэтаю забраніраваньня для іх ходкіх прадметаў.

10. Па Госрыбсындыкату. Несваечаснае атрыманьне ад Аптэкакіраўніцтв задатковых сум і вэксалёў на забраніраваную для БССР колькасьць рыб'яга тлушчу з аднаго боку ставіць Белмэдгандаль у вельмі цяжкае фінансавае становішча, а з другога боку ў плянуючых органаў зьяўляецца падстава для таго, каб на будучы час скарачаць прадметы, якія імі разьмяркоўваюцца. З прычыны гэтага магчымы востры дэфэкт у рыбім тлушчу па тых акругах, якія дагэтуль не ўрэгулявалі гэтага пытаньня. Звярочваючы ўвагу Аптэкакіраўніцтв на вышэйпамянёнае, Белмэдгандаль загадзя паведамляе, што ён вымушаны зьняць з сябе адказнасьць за забесьпячэньне рыбім тлушчам тых Аптэкакіраўніцтв, якія зьявіліся неакуратнымі. Гэта, зразумела, не датычыцца тых Аптэкакіраўніцтв, якія сваячасна прыслалі свае заяўкі і авансы; іх заяўкі будуць выкананы поўнасьцю.

Сьпіс імпортавых тавараў, якія атрыманы Белмэдгандлем на працягу траўня і чэрвеня г. г.

A

Assa foetida
Atophan II
Balsamum Copaivae
Bismut. subnitricum
Calcium bromatum
Camphora japonica raffinata
Castoreum canadense
Chinin. aethylo—carbonic (Euchinin)
„ bromatum
„ muriaticum
„ sulfuricum
Cortex aurant. expulpat. totum
„ cascarae sagradae
„ Condurango
Jodum
Luminal II
Menthol recristallis.
Novocain
Nux vomica
Oleum santali
Perhydrol
Radix ipecacuanae pulv. subtillis.
„ „ concis.
„ gentianae
Tartarus stibiatus puriss. pulv.
Theobromin n. salicylic.
Tubera jalappae pulv.
Vaselin american. flav.
„ „ alb.

Б

Апарат Рэнтгена Гросс-Геліодор з штатывам Поліскоп перам. току 220 в.
„ „ „ пастаян. току 220 в.
„ „ „ „ „ 110 в.
Камэры рахункавыя Цюрка
Перарывальнік электрычны 220 в. пастаян. току
„ „ 110 в. перам. току
Шпрыцы Record 2 грам., 5 грам. і 10 грам.

В

Зубаўрачэбныя прылады

Клешчы зубаўрачэбныя
Наканечнікі кутавыя №№ 7 і 4
Прэсы Самсона
Шпрыцы для вады
Шпрыцы Фішэра
Элеватары двубаковыя

Зьмены цэн

I. За травень

A.

Acid. mur. pur. 1 р. 05 к. N
„ nitr. ch. pur. пры 25 K⁰—1 р. 71 к., пры K⁰—1 р. 73 к. + 10%
Алігнін K⁰ 98 к. N
Argent. nitr. stift туз 1 р. 20 к. N
Ampul. pantopon 2% пры 100 шт. 4 р. 95 к., пры 25 шт. 5 р.+4%

Cortex aurant. пры 25 К⁰—1 р. 55 к., пры К⁰—1 р. 60 к.+10%
Charta sinapis сто—80 к. N
Orchicrin 0,3×25 фл. 1 р 10 к., скідка 25%
Пітуікрын Т у ампул. 4 р. скідка 25%
" А " " 4 р. " 25%
Прэпараты Інстытуту Экспэрымэнтальнай Эндокрынолёгіі скідка 25%
Supposit. Cocain 0,01 / Butyr. cacao 2,8 } дзесят. 45 к. N
Сываратка стрэптокок. полівал. а 10 к. фл. 80 к. N
Tabl. Natr. bicarbon. 0,2 / Codein phosphor. 0,015 } К⁰ 31 р. N
" Opii pulv. 0,015 / Sacchar. 0,3 } " 4 р 80 к. N
" Thiocol. 0,3 / Cod. pur. 0,015 } " 35 р. N
" Aspirin. 0,5 / Coff. N. Salicyl. 0,15 } " 14 р. 20 к. N
" Natr. bicarbon. 0,3 / Codein. 0,015 } " 28 р. N
Fol. hyoscyami conc. 25 К⁰—61 к., пры К⁰—63 к.+10%

Б.

Аўтаклаў 35×50 — 600 р.
Бінты суровай марлі 5 м. 1½ в. шт. 10 к. N
" " " " 2½ в. " 13 к. N
Вата фасоўка ў 10,0—95 к.
Ватаадбросы — 2 р. 65 к.
Грэлкі электрычныя — 6 р. 75 к. N
Голкі вочныя для іншародных цел — 1 р. 40 к.
Паста муміфікацыйная — 2 р. 95 к.
Плювалкі кішэнныя сто — 4 р. 70 к. N
Падстаўкі для аднэй каробкі Шымельбуша—38 р. 50 к.
Пэсары Годжэ 75 м/м. туз. 7 р.
" " 80 і 90 " 8 р.
Столік зубаўрачэбны сьценны — 52 р. N
Стэрылізатар электр. 42×18 — 54 р. N
" " 29×15 — 37 р. N
" " 23×12 — 28 р. N
" зубаўрач. на ножках — 4 р. N
Трубкі Рэнтгенаўскія газавыя тыпу ПЗВ—205 р. N
Фото-ванны 15×20 шт. 2 р. 10 к. N
" 20×26 " 3 р 15 к. N
" 33×45 " 5 р. 25 к. N
Фотографічны цыстоскоп — 200 р.
Шклянкі для дэзынфэкцыі — 1 р. 40 к. N
" " прыёму лекаў сто 15 р. N
Шафа сушыльная мядзяная — 37 р. N
Шпрыцы Фішэра комплект 4 р. 25 к. N
" для вады — 2 р. 15 к. N
Шоўк у шпульках — 38 к.
" кручаны № 2-3-5 маток — 32 к.
" хірургічны № 2 — 16 к.
Шчоткі доктарскія б/р. II туз. 1 р. 20 к.
" " I с. туз. 1 р. 75 к.

II. За чэрвень

А.

Adonilen 15,0 — 70 к.
Chlor. aethyl 5×10 ам. 60 к.
" 10×5 ам. 65 к.
Вінаградны цукер К⁰ 5 р. 35 к.
Воск пуш. 2 р. 40 к. N

Digalen (gitalen) 15,0 — 1 р.
Phytin pulv. 1/4 K⁰ — K⁰ 12 р.
" " 1/2 " K⁰ — 11 р. 50 к.
Сываратка мэнінгокок. 10 — 80 к. N
Tabl. sacchar. pulv. 0,3 codein pur. 0,01 } K⁰ 20 р. N
" Sacchar. pulv. 0,3 codein pur. 0,015 } " 28 р. N

Б.

Апарат унівэрсальны сыстэмы Залатарова для гальванізацыі, фарадызацыі і эндоскопіі з 4 камэрамі-ваннамі з міліампэромэтр. — 700 р.
Апарат Орса-Фішэра — 65 р. N
" Флюгэ — 45 р. N
Аўтаклаў двухбаковы 30×50 — 535 р. N
" " 35×50 — 570 р. N
" " 40×60 — 690 р. N
Барабан для пробы востр. інструм. — 1 р. 35 к.
Вага сыстэмы Фэрбэнкса — 170 р.
Голкі ін'екцыйныя зубн. тузін 30 к. N
" кішочн. і хірургічн. тузін 95 к. N
" Record тузін 2 р. 50 к.
Інгалятар латун. нік. — 4 р. 75 к.
Канюля з сланов. косьці шт. 35 к.
Катэтры мужчын. мэт. — 2 р. 90 к.
Каробкі Шымэльбуша 28 с/м — 17 р. N
" " 33 с/м — 20 р. N
" " 38 с/м — 23 р. N
Маскі для хлёраформу — 1 р. 30 к.
" Эсмарха шт. 1 р. 25 к.
Пінцэты расьнічн. шт. 1 р. 10 к.
" Дзюрсэна 3 р. 20 к.
Пласьцінкі шклян. шт. 35 к.
Перарывацель электр. Констант. 220 вольт сталага току — 315 р.
" " " на 110 вольт перамен. току — 660 р.
Скобкі Мішэля 100 шт. 75 к.
Слоікі з пр. корк. 200,0 шт. 58 к. N
Стэрылізатар нік. 132 р. N
" зубаўрач. на ножк. шт. 4 р. N
Столік для хірургічн. інструм. 72 р.
Трубкі рэнтг. вэнтыльн. тыпу В2 80 р.
Фонэндоскопы (мікромэмбраны) 2 р. 25 к.
Шпрыц вочны Анэля Record 6 р. 30 к.
" для тубэркул. 1,0 2 р. 65 к.
Шчоткі з мэтал. цэнгр. 20 к.
" для рук валас. 100 шт. 9 р. 50 к.

Зьліцьце Лябараторыі Менскага Аптэкакіраўніцтва з Хэмфармзаводам Белмэдгандлю

Паводле дагавору Белмэдгандлю з Менскім Аптэкакіраўніцтвам за 4 чэрвеня 1928 г. Лябараторыя апошняга ліквідуецца. Белмэдгандаль будзе забясьпечваць Менскае Аптэкакіраўніцтва галенавымі прэпаратамі, фасоўкай і іншымі прадметамі, якія вырабляліся лябараторыя да яе ліквідацыі, у разьмерах поўнай патрэбы аптэчных прадпрыемств, падпарадкаваных Аптэкакіраўніцтву.

Лексыравіна

Цяпер канчаецца вясновая загатоўка лексыравіны – крушыны, ландышу, аернага кораню, смарчкоў. Трэба ўлічыць практыку, каб выправіць усе недалікі да летняй і асеньняй загатоўкі.

Вясновая загатоўка прайшла больш-менш пасьпешна ў адносінах да двух відаў — крушыны і ландышу, вельмі слаба са смарчкамі (дзякуючы неўраджаю) і з аерным коранем.

Ня гледзячы на нашы неаднакротныя паказаньні Аптэкакіраўніцтвам аб неабходнасьці кожныя 2 тыдні прысылаць зводкі загатовак, мы іх не атрымліваем і ня можам даць патрэбныя зьвесткі Наркамгандлю, што выклікае непаразуменьні.

Да гэтага часу, паводле маючыхся ў нас няпоўных вестак, выкананы плян па ландышу (100 п.) і крушыне (3.000 пуд.). Нездавальняючай зьяўляецца загатоўка аернага кораню.

Шмат якія аптэкакіраўніцтвы заўважваюць нізкія цэны на аерны корань; паміж тым коопэрацыя загатаўляе яго па гэтым цэнам даволі пасьпешна.

Белмэдгандаль пасылае сваіх інструктараў амаль ўва ўсе важнейшыя раённыя аптэкі для інструктаваньня і паказаньняў, пры гэтым яны выявілі што ня ўсюды Аптэкакіраўніцтвы і асабліва загадчыкі аптэк сузнаюць усю неабходнасьць і паважнасьць загатоўкі.

Неабходна каб Аптэкакіраўніцтвы падцягнулі загадчыкаў аптэк такім чынам, каб у васеньнюю загатоўку пашырыць работу.

З паасобных Аптэкакіраўніцтв больш-менш пасьпешна вядуць работу, організацыйна і па колькасьці загатаўляемага тавару,—Мазырскае, Бабруйскае і Гомельскае Аптэкакіраўніцтвы, слаба—Менскае, Полацкае і Аршанскае; Віцебскае амаль што зусім не работае. Ад Магілеўскага Аптэкакіраўніцтва зьвестак не атрымана.

Неабходна зараз-жа зьвярнуць увагу на загатоўку канюшыны, валошкі і ліпавага цьвету, сэзонам загатоўкі якіх зьяўляецца ліпень. Паводле пляну патрэбна 1.000 пуд. канюшыны і 500 пуд. ліпавага цьвету.

Гомельскай і Віцебскай акругам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на загатоўку ліпавага цьвету, а Віцебскай і Полацкай—на загатоўку канюшыны, якіх у памянёных акругах маецца больш за ўсё.

У далейшым неабходна зьвярнуць узмоцненую ўвагу на загатоўку вельмі важных для нас прадметаў—чарніцы, маліны, галаўні, лікаподыуму і ялаўцовых ягад.

Згодна нашага дагавору з Белкоопсаюзам мы організуем 3 супольныя базісныя склады—у Полацку, Гомелі і Менску, куды Аптэкакіраўніцтвы накіроўваюць загатоўленую імі сыравіну.

Апрача валяр'янавага кораню, які адпраўляецца беспасрэдна ў Менск Белмэдгандлю, астатняя лексыравіна адпраўляецца ў базісныя склады ў наступным парадку: Менская і Бабруйская акругі—у Менск; Гомель і Мазырь—у Гомель; Магілеў, Ворша, Віцебск і Полацк—у Полацк. Пры гэтым цяжар адрасуецца адпаведнаму Аптэкакіраўніцтву, а ў Менск—Белмэдгандлю, якія перадаюць дублікат і тавар базіснаму складу; апошні складае прыймовы акт у 2 экзэмплярах і перасылае арыгінал Аптэкакіраўніцтву, якое паслала тавар, а копію—Белмэдгандлю.

Шмат якія кіраўнікі аптэк, згодна маючыхся ў нас зьвестак, адпраўляюць сялян з лексыравінай у коопэрацыю, што таксама шкодзіць нашай рабоце.

Неабходна зжыць гэтыя ненармальнасьці.

Трэба таксама зьвярнуць увагу на якасьць сыравіны.

Нам прысланы некаторыя тавары, напр. крушына, у якой ёсьць мешаніна розных гатункаў дрэваў, апрача крушыны (Чэрвень, Менскай акругі), а таксама валяр'янавы корань зусім нягодны (Талочын, Аршанскай акругі).

Адносна крушыны можна яшчэ аб'ясьніць недасьведчанасьцю кіраўнікоў аптэк, але валяр'янавы корань ведае кожны фармацэўты, і прысылка мокрага, нячыстага тавару, які не паддаецца нават перапрацоўцы, залежыць ад нядбайлласьці загадчыка аптэкі

На якасьць сыравіны неабходна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу.

Трэба мець на ўвазе, што невыкананьне намі пляну загатовак ставіць пад пагрозу задаваленьне нашых імпортавых ліцэнзый на мэдыкамэнты і мэдыцынскае абсталяваньне.

Праўленьне.

СОДЕРЖАНИЕ

Общественное здравоохранение и гигиена

Клиническая медицина

Заметки из практики